# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
Выдаецца з кастрычніка 1991 г.
№ 26 (1465)
27 чэрвеня 2020 г.


Напярэдадні свята Незалежнасці

...З феерыяй колераў, імпрэсіяністычнымі пленэрнымі эцюдамі "настраёвых" жывапісцаў, летнім вясёлкавым дажджом, містычнымі сполахамі Космасу асацыюцца ўнікальныя каскады фантанаў на водах Свіслачы, што працякае праз ландшафт цэнтральных сталічных паркаў. Імгненні захапляльнага піршаства летніх эмоцый людзей і чараўніцтва спецыялістаў маглі некалькі вечароў запар назіраць мінчукі, у тым ліку і фотакарэспандэнт "К", якія адмыслова прыязджалі на набярэжную ракі, каб папрысутнічаць на пробных пусках фантастычнага фантана. Пакуль тое было толькі выпрабаваннем сістэмы. Урачыстае адкрыццё аб'екта адбудзецца ў Дзень Незалежнасці 3 ліпеня. Святочны падарунак гораду зрабіў "Сбербанк".

# Імпрэсіянізм на "палітры" Свіслачы

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Актуальна

## БІЛЕТ З АДКРЫТАЙ ДАТАЙ

Як пачуваюць сябе абласныя філармоніі і не толькі? Што прапаноўваюць меламанам у сённяшніх умовах?

ст. 3

а"К"но ў свет

## ГОЛУБ НА ПОСТАРЫ ЯК ПАХОДНЯ ДАБРЫНІ

Дзве нашыя стужкі "Беларусьфільма" трапілі ў конкурсную праграму прэстыжнага міжнароднага фестывалю ў Хірасіме.

ст. 7

Погляд з XXI стагоддзя

## АПОШНІ ВЫХАД СЯМЁНА ЗОРЫЧА

Сёння мы завяршаем серыю публікацый аб выбітнай гістарычнай асобе, якая шмат чаго зрабіла для развіцця культуры Шклова.

ст. 14


ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

**На мінулым тыдні ў вёсцы Боркі Кіраўскага раёна з удзелам ва ўрачыстай цырымоніі Кіраўніка дзяржавы быў адкрыты пасля рэканструкцыі мемарыяльны комплекс "Памяці спаленых вёсак Магілёўшчыны". Першы помнік загінуўшым жыхарам Боркаў і наваколля тут паставілі яшчэ ў 1964 годзе. У 2004 была ўзведзена капліца, а яшчэ праз чатыры гады комплекс быў дапоўнены Сцяной памяці з назвамі спаленых вёсак. І вось апошняя рэканструкцыя, у выніку якой мемарыял дапоўнены прасторавымі кампазіцыямі і пластыкай надзвычайнай эмацыянальнай сілы.**

# Пластыка надзвычайнай сілы

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Аўтары праекта — мінскія скульптары Іван Арцімовіч і Аляксандр Сакалоў, магілёўскі архітэктар Марыя Левашова. Яны перамаглі ў конкурсе, абвешчаным Магілёўскім аблвыканкамам і Кіраўскім райвыканкамам. Цяпер цэнтральны вобраз мемарыяла — скульптура "Беларусь — смуткуючая маці" ў атачэнні канструкцый, што нагадваюць кроквы, на якіх няма даху — гэта тое, што засталося ад разбуранага дома.

"Іншы раз наш помнік параўноўваюць з Хатынню. Лічу такое параўнанне не надта карэктным. Хатынь — помнік сусветнага маштабу, і калі мы хоць крыху да яго наблізіліся — гэта ўжо добра. Адно магу сказаць дакладна: у нас усё атрымалася, як мы задумалі, а ў некаторых момантах нават пераўзышлі тое, што планавалі пачаткова" — кажа Іван Арцімовіч.

Аляксандр Сакалоў таксама ганарыцца вынікам творчай працы, але мяркуе, што сапраўдную ацэнку мемарыяла вызначыць час.

Марыя Левашова засяроджвае ўвагу на патрыятычна-выхаваўчым значэнні мемарыяльнага комплексу. Ён патрэбны, каб нагадваць новым пакаленням, якімі стратамі і ахвярамі здабыты мір на нашай зямлі.

Зусім невыпадкова адным з элементаў мемарыяла з'яўляецца парк, які сімвалізуе адраджэнне жыцця на папялішчы...

К

**На здымках: фрагменты мемарыяла ў Борках.**
Фота з Сеціва

# Лета ў "музычнай Галактыцы"

**Першы летні месяц завяршаецца, а лета музычнае — толькі пачынаецца: 28 чэрвеня аматараў класікі чакае Міжнародны анлайн-канцэрт "Гранд-лета". Гэта больш за 100 музыкантаў з усіх кантынентаў (вядома, акрамя Антарктыды) — і каля васьмі гадзін музыкі.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

Арганізатарам выступіла Музычная школа Арцёма Шаплыкі, дзе вучацца не толькі дзеці, але і дарослыя — усе па сваіх індывідуальных праграмах, у залежнасці ад мэтаў кожнага з навучэнцаў. Гэта ўстанова і раней ладзіла разнастайныя акцыі, скіраваныя на папулярызацыю "разумнага, добрага, вечнага": дастаткова згадаць цыкл лекцый з "жывой" музыкай у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Але цяперашняе "Гранд-лета" — першы падобны праект у Беларусі.

— Штогоднія канцэрты навучэнцаў сталі ў нас традыцыяй, — распавёў лаўрэат міжнародных конкурсаў, стыпендыят і дыпламант спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, саліст Беларускай дзяржаўнай філармоніі, заснавальнік і дырэктар згаданай школы Арцём Шаплыка. — Сёлетні таксама быў запланаваны ў Камернай зале імя Рыгора Шырмы. Мы і раней уключалі ў такія канцэрты, акрамя сваіх навучэнцаў, выступленні прафесіяналаў: гэта заўсёды карысна, прычым для абодвух бакоў. А сёлета, калі стаў зразумелы фармат анлайн, спрацавала яшчэ "сарафаннае радыё": да нас сталі звяртацца музыканты з самых розных краін.

Мы не абмяжоўваліся толькі фартэпіяна: ёсць і вакал (дарэчы, з Мексікі), флейта, скрыпка, віяланчэль, гітара. Не ўсе рабілі запісы дома, многія спецыяльна шукалі нейкія нечаканыя ракурсы, месцы здымак, стваралі адметны знешні антураж. Гітарыст, да прыкладу, выбраўся ў лес, каб сыграць ва ўлонні прыроды. Мы ж, у сваю чаргу, падрыхтавалі афішы, зрабілі мантаж, каб вытрымаць пэўную драматургію. Канцэрт будзе мець і ўступнае слова, і сваю вядучую, і цітры да кожнага выступлення. У іх мы пазначаем не толькі імёны музыкантаў-аматараў (а гэта каля 70 дзяцей і 40 дарослых), але і асноўную прафесію, пасаду кожнага. Каго тут толькі няма! Бізнесмены, праграмісты, цырульнік, дырэктар завода, шафёр, урач... Музыка для іх не проста хобі, а яшчэ і дадатковая магчымасць ажыццявіць сваё права на творчую самарэалізацыю. Мы толькі дапамагаем ім рэалізаваць свае мары. І гэта цудоўна! Шырокі аматарскі рух даўно распаўсюджаны ў многіх краінах свету, у еўрапейскіх гарадах і мястэчках дзесяцігоддзямі праходзяць міжнародныя фестывалі, арыентаваныя на сямейнае, сяброўскае камернае музіцыраванне, на іншыя мастацкія формы баўлення вольнага часу. Таму не трэба здзіўляцца, што сярод нашых удзельнікаў — прадстаўнікі не толькі "блізкага кола" краін-суседак кшталту Расіі, Украіны, але і з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Кітая, Нарвегіі, Францыі, іншых рэгіёнаў "музычнай Галактыкі". Музыка не мае межаў!

К

# У форме ёмістага канспекта

**Кажуць, найбольш працяглымі ў часе чамусьці становяцца праекты, якія зыходна бачыліся як эпізадычныя. Вось, да прыкладу, адзін з найлепшых музеяў Нідэрландаў мусіў стаць на рамонт і рэстаўрацыю. А каб нават часова не выпадаць з культурніцкай прасторы, адну залу пакінулі ў рабочым стане і ў ёй разгарнулі маленькую экспазіцыю, якая была "дайджэстам" ці "канспектам" экспазіцыі вялікай, на той момант зачыненай. Па заканчэнні рэстаўрацыйных работ, калі музей зноў запрацаваў у звыклым рэжыме, "канспект" збіраліся дэмантаваць. Але не сталі гэтага рабіць, бо грамадзе такі экспазіцыйны ход падаўся вельмі прывабным, цікавым. Ёсць гэты "канспект" у структуры музея і зараз. Як кароткая прадмова да вялікай кнігі.**
**Мне гэта гісторыя згадалася ў сувязі з выставай "Вялікая Перамога", што разгорнута зараз у нашай Нацыянальнай бібліятэцы.**

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Адкрылася яна яшчэ ў красавіку і будзе працаваць да канца юбілейнага года. Гэта выстава — вынік супрацоўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тут экспануюцца сапраўдныя рэчы з фондаў музея; друкаваныя выданні і выяўленчыя матэрыялы, што належаць бібліятэцы, арыгіналы і копіі ўнікальных дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Зрабіла ўнёсак у справу і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Падпарадкаваны яму Дзяржаўны музей гісторыі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь прадаставіў баявы гвардзейскі сцяг і сцяг партызанскай брыгады.

Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" паўдзельнічала ў праекце рэчамі, якія скарыстоўваліся на здымках фільмаў пра вайну, а таксама і прынамсі фільмамі.

Мноства артэфактаў распавядаюць пра бесчалавечную сутнасць акупацыйнага рэжыму ў Беларусі і пра маштабы нацыянальнага супраціву акупантам.

Адначасова з праектам, пра які ідзе гаворка, на экспазіцыйных плошчах Нацыянальнай бібліятэкі адбываецца выстава "Лясная песня", прысвечаная партызанскаму руху ў ягоным баявым і паўсядзённым аспектах.

Падсумоўваючы адзначу, что выстава "Вялікая Перамога" — гэта "дайджэст", вельмі зручны для гледача. Пра Вялікую Перамогу тут распавядаецца коратка, але ёміста. Вельмі добра, што выстава будзе працаваць увесь юбілейны год. А я б яе і надалей пакінуў...

К

**Частка экспазіцыі ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Алег КЛІМАЎ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Таццяна ПАШЭНЬКА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэклямны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
**Дырэктар** — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
**першы намеснік дырэктара** — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.** Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2020.
Наклад 3195. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 26.06.2020 у 15.00. Замова 1962.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

# Білет з адкрытай датай

**Музыка, як і ўсё мастацтвы, — вечная і неабходная многім аматарам філарманічных пляцовак краіны. Чым сёння жывуць абласныя філармоніі Беларусі, як пачуваюць цяпер, калі каранавірусная хваля паціху пачынае адступаць, як аднаўляць сваю дзейнасць, ці "піярылі" ды "піяраць" сябе ў інтэрнэце і ці не баяцца страціць гледача — пра ўсё гэта і многае іншае даведалася "К".**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Падчас музычна-тэатралізаванай праграмы Віцебскай абласной філармоніі.

*Як пачуваюць сябе абласныя філармоніі? Ды не адны яны…*

## АРХІЎ ДЛЯ КОЖНАГА

Адразу, мабыць, варта сказаць, што літаральна ўсе абласныя філармоніі за мінулыя два месяцы актыўна прэзентавалі сябе на прасторах інтэрнэту. Напрыклад, не так даўно Брэсцкая абласная філармонія запусціла праект пад назвай #філармоніяанлайн. Так што цяпер пабываць на канцэртах любімых выканаўцаў можа любы ахвотны, прычым, абсалютна бясплатна і не выходзячы з дома.

— Паколькі ў нас ужо былі падрыхтаваны цікавыя праграмы, якія мы планавалі прэзентаваць у гэтым сезоне, а артыстам, як вядома, вельмі складана рэпеціраваць без гледача, было вырашана ўсё ж такі пайсці такім шляхам — пачаць серыю відэа-канцэртаў, — адзначыла ў размове з "К" дырэктар Брэсцкай абласной філармоніі Таццяна Калтынаева. — Напрыклад, праграму да 9 Мая — а гэта два канцэрты з удзелам інструментальнага ансамбля "Рапсодыя" і камернага аркестра — мы прэзентавалі анлайн. І гэта зразумела, бо з гледачамі трэба працягваць кантактаваць і дарыць ім сваю творчасць.

Відэа-канцэрты ў Брэсцкай абласной філармоніі прайшлі і да іншых знакавых дат, напрыклад, да Дня сям'і, калі быў прэзентаваны мюзікл "Муха-цакатуха", а таксама да Дня дзіцяці.

— Усе нашы трансляцыі адбываюцца не ў прамым эфіры, а ў запісе, — кажа Таццяна Калтынаева. — Ролікі даступныя на канале YouTube, а таксама ў сацыяльных сетках.

У сённяшняй сітуацыі, па словах кіраўніка ўстановы культуры, ёсць і пэўны пазітыўны момант.

— Раней мы запісвалі не ўсе свае канцэрты ад пачатку да канца, а толькі нейкія фрагменты, — кажа кіраўнік установы. — А цяпер у нас з'явілася рэальная магчымасць папоўніць сваю картатэку запісамі ўсіх нашых праграм, стварыць паўнацэнны архіў сваіх выступленняў. А канцэртных праграм, як вы разумееце, у нас вельмі шмат.

Як кажуць у такіх выпадках, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Па словах Таццяны Калтынаевай, на сёння Брэсцкая абласная філармонія рыхтуе да паказу новыя праграмы, у тым ліку, нават навагоднія. А па планах рэальнае, а не віртуальнае жыццё тут распачнецца з 3 ліпеня, у Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Інтэрнэт-конкурс "Купальская зорка" Магілёўскай абласной філармоніі.

## ВІТАМІНКА І ВІТАМІНЫ

Калі ў Брэсце толькі чакаюць аднаўлення сваёй працы, дык у Віцебскай абласной філармоніі зусім нядаўна прыступілі да рэальных паказаў імпрэзаў, праўда, на свежым паветры. Так, 20 чэрвеня артысты зладзілі для дзяцей музычна-тэатралізаваную праграму "Вандроўка Вітамінкі".

Дзея ладзілася ва ўнутраным дворыку філармоніі, дзе артысты Надзея Драбо ў ролі Вітамінкі і Сяргей Белавусаў у ролі Віруса расказвалі дзецям пра тое, як ператварыць вірус у імунітэт. Аказваецца, рэцэпт даволі просты: трэба есці яблыкі і іншыя прыродныя вітаміны, рабіць прышчэпкі, рэгулярна займацца спортам, а таксама выконваць правілы асабістай гігіены.

Па словах дырэктара ўстановы культуры Алены Падаляк, гэта першы падобны філарманічны open-air сёлетняга лета.

— Да гэтага часу мы, як і, мабыць, усе нашы калегі з іншых рэгіёнаў Беларусі, шмат часу аддавалі працы ў фармаце анлайн, — кажа кіраўнік установы культуры. — Напрыклад, размяшчалі праграмы, што былі запісаны намі раней, у сацыяльных сетках. Імкнуліся такім чынам падтрымаць цікавасць нашых гледачоў і, натуральна, прыдбаць сабе новых прыхільнікаў.

Падобным шляхам пайшлі і ў Гродзенскай абласной філармоніі, дзе, па словах дырэктара ўстановы Валерыя Слабыша, з інтэрнэтам сябруюць здаўна і даволі паспяхова. Так, сапраўды традыцыйнымі сталіся сустрэчы артыстаў і гледачоў у віртуальнай гасцёўні. Напрыклад, 18 чэрвеня тут адбылася сустрэча з баяністам Яўгенам Сафонавым. Музыкант выканаў лепшыя кампазіцыі са свайго рэпертуару, якія ўжо цягам доўгага часу радуюць гледача.

А 9 чэрвеня Гродзенская абласная філармонія распачала новы сезон музычных вечароў на свежым паветры. Арт-праект пад назвай "Канцэрты на балконе" адкрыўся вакальнымі і інструментальнымі нумарамі, за якімі з прыемнасцю і, натуральна, з захаваннем неабходнай сацыяльнай дыстанцыі назіралі шматлікія жыхары горада над Нёманам. Трэба было проста ўзняць галаву, каб пабачыць выступленні артыстаў з вышыні некалькіх метраў над зямлёй.

Канцэрты на балконе Гродзенскай абласной філармоніі.

Відэа-канцэрт ад Брэсцкай абласной філармоніі на YouTube.

## ЧЫЯ КУПАЛЬСКАЯ ЗОРКА?

Не варта і казаць, што падобныя спробы зацікавіць свайго гледача, слухача і наведвальніка прымалі і прымаюць іншыя абласныя філармоніі Беларусі. Напрыклад, Магілёўская абласная філармонія запусціла днямі музычны анлайн-марафон у падтрымку медыцынскіх работнікаў "Рукі, якія дораць жыццё". Трансляцыі музычных нумароў салістаў і творчых калектываў прайшлі з 2 па 19 чэрвеня ва ўсіх акаўнтах сацыяльных сетак і на YouTube-канале ўстановы культуры. Завяршыўся марафон напярэдадні Дня медыцынскага работніка фінальным гала-канцэртам, які таксама прайшоў у анлайн-фармаце.

— Акрамя таго, цягам мінулых месяцаў мы зладзілі шэраг анлайн-канцэртаў, — адзначыла "К" мастацкі кіраўнік і в.а. дырэктара Магілёўскай абласной філармоніі Святлана Ефімук. — Так, 28 мая прайшоў анлайн-канцэрт, прысвечаны 75-годдзю з Дня Перамогі пад назвай "Вярніце памяць..." А яшчэ мы прынялі ўдзел у нядаўнім адкрыцці мемарыяльнага комплексу памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці ў вёсцы Боркі Кіраўскага раёна.

Натуральна, самым бліжэйшым часам артысты і калектывы Магілёўскай філармоніі будуць удзельнічаць і ў святочнай праграме з нагоды Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусі, а таксама ў Рэспубліканскім свяце "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў"), што пройдзе 11 — 12 ліпеня ў Шклоўскім раёне. А яшчэ з 5 мая па 10 чэрвеня ўстанова культуры зладзіла інтэрнэт-конкурс "Купальская зорка", на якім выступалі салісты ў намінацыях "Акадэмічны вакал", "Народны вакал", "Эстрадны вакал" і "Песня на беларускай мове".

Дарэчы, сёлета Магілёўская абласная філармонія адзначыць свой 30-гадовы юбілей. Да святочнай даты артысты зладзяць шэраг адметных імпрэз, якія, безумоўна, запомняцца жыхарам не толькі Магілёва, але і ўсёй Магілёўскай вобласці, надоўга.

## МУЗЫКА БЕЗ МЕЖАЎ

Не варта і казаць, што ўсе згаданыя мной прыклады паспяховага анлайн-жыцця абласных філармоній іх кіраўнікі збіраюцца працягнуць і надалей. І гэта цалкам адпавядае тым тэндэнцыям, якія ідуць не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце: многія, асабліва моладзь, цяпер шукаюць інфармацыю пра культурнае жыццё свайго раённага ці абласнога цэнтра менавіта ў Сеціве. Так што актыўна сябе пазіцыянаваць і "раскручваць" з дапамогай віртуальнай прасторы не проста трэба, а неабходна. Інакш без анлайн-рэкламы і прыцягнення ўвагі інтэрнэт-наведвальнікаў — наведвальнікаў рэальных можна і не дачакацца.

Перафразуючы вядомую прымаўку, можна сказаць, што без інтэрнэту сёння — як без вады. Гэтую маю думку пацвердзіў і дырэктар Гомельскай абласной філармоніі Аляксандр Рабянок, які адзначыў, што яго ўстанова таксама шмат што робіць у анлайн-фармаце.

Напрыклад, не так даўно тут зладзілі анлайн-праект #МузыкаБезМежаў, які выклікаў вялікую цікавасць у віртуальных наведвальнікаў. У яго рамках прайшлі пазнавальны спектакль "Небяспечная гульня" тэатра "Вырастайка", сустрэчы з артыстамі філармоніі ды многае іншае.

Акрамя таго, сёння ў Гомелі рэалізуецца творчы праект абласной філармоніі "Гуляем і спяваем з аркестрам". Таленавітыя выканаўцы могуць праявіць свае мастацкія здольнасці, выступіўшы з камерным аркестрам філармоніі пад кіраўніцтвам Андрэя Глазянкова. Сёлета ў сілу абставін у праекце прыняло ўдзел усяго шэсць выканаўцаў — адна вакалістка і пяць інструменталістаў. Відэа-версія выканання класічных твораў, як абяцаюць арганізатары, будзе ў хуткім часе выкладзеная ў інтэрнэт.

І апошняе. Днямі на сайце Беларускай дзяржаўнай філармоніі з'явілася просьба да наведвальнікаў не здаваць квіткі на адмененыя ці перанесеныя канцэрты. Як адзначаецца, усе набытыя раней квіткі будуць мець статус "білета з адкрытай датай", гэта значыць даюць права наведаць любы канцэрт філармоніі (акрамя тых, якія ладзяцца на ўмовах арэнды) па выбары да 1 снежня 2020 года. У дзень наведвання канцэрта трэба проста звярнуцца ў касу філармоніі для ўдакладнення глядацкага месца ў зале.

Што ж, даволі разумны і прадуманы ход: філармонія не губляе ні грошы, ні сталых наведвальнікаў. Не кажучы ўжо пра тое, што падобная рэкламная акцыя таксама прыцягвае ўвагу да філарманічных канцэртаў многіх людзей. Магчыма, варта распаўсюдзіць падобны вопыт і на абласныя філармоніі? Бо інтэрнэт — інтэрнэтам, але сапраўдныя грошы за канцэрты для філармоній могуць прынесці толькі рэальныя наведвальнікі музычных імпрэз.

К

# Ахоўваецца дзяржавай — аберагаецца грамадствам

*Які ён сёння, Спіс нашых каштоўнасцяў?*

**Неўзабаве споўніцца ўжо трыццаць гадоў з моманту, як у нашай краіне ажыццяўляецца самастойнае кіраванне аб'ектамі гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўным дакументам іх уліку з'яўляецца Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, створаны ў 1992 годзе. Заканадаўства па ахове спадчыны ўвесь час змяняецца і адаптуецца да новых абставін ды выклікаў часу, расце і спіс помнікаў, узятых пад ахову дзяржавы, з'яўляюцца ды развіваюцца новыя катэгорыі каштоўнасцяў — перадусім нематэрыяльных.**

Антон РУДАК

Вялікая разнастайнасць новых відаў каштоўнасцяў патрабуе пошуку і неардынарных падыходаў да работы з імі, абмеркаваць і адшукаць якія сёння спрабуюць беларускія адмыслоўцы ў галіне аховы культурных набыткаў. 19 — 20 чэрвеня адбылася навукова-практычная канферэнцыя "Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў: выклікі і рашэнні", прысвечаная пытанням уліку культурнай спадчыны Беларусі. Мерапрыемства прайшло ў анлайн-фармаце ў рамках ініцыятывы "Права на спадчыну", зладжанай Беларускім камітэтам ICOMOS.

У межах васьмі тэматычных секцый прагучалі амаль тры дзясяткі дакладаў. Удзельнікамі абмеркаванняў былі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, адказныя за ахову гісторыка-культурнай спадчыны, грамадскасці, супрацоўнікі ўстаноў культуры, актывісты мясцовых супольнасцяў, архітэктары і рэстаўратары. Асноўная ўвага была нададзеная вызначэнню ролі, якую адыгрываюць у кіраванні спадчынай як мясцовыя органы ўлады, так і грамадская ініцыятыва.

Дакладчыкі прапанавалі разгледзець найлепшыя схемы кіравання спадчынай і праблемы яе захавання ды выкарыстання на прыкладзе шэрагу паспяховых праектаў. Асобныя даклады былі прысвечаныя метадалогіі ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў, практычным парадам па падачы прапаноў на атрыманне ахоўнага статусу, нюансам работы з такімі спецыфічнымі катэгорыямі помнікаў, як воінскія пахаванні, гістарычныя могілкі, помнікі традыцыйнага драўлянага дойлідства...

## АДЗІНЫ ЗАМЕСТ ТРОХ

Упершыню дакумент кшталту дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцяў быў ухвалены французскай Камісіяй гістарычных помнікаў яшчэ ў 1840 годзе, і менавіта з таго часу ў свеце адбываецца фарміраванне і няспыннае развіццё сістэм аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Гэта, у пэўным сэнсе, рэвалюцыйны момант — бо ўпершыню ў свеце, дзе панавала прыватная ўласнасць, было прызнана, што ўласнік не мае права зрабіць усё, што яму заманецца, з аб'ектам, які прызнаны помнікам.

У нашай краіны быў свой доўгі і звілісты шлях да ўсведамлення неабходнасці клопату пра помнікі ўласнай мінуўшчыны. Першыя крокі ў гэтым кірунку рабіліся яшчэ ў савецкі перыяд, але, вядома, гарантаваць самастойную палітыку ў згаданай сферы магло толькі атрыманне незалежнасці. Ужо ў 1992 годзе Рэспубліка Беларусь адной з першых на постсавецкай прасторы прыняла Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны", згодна з якім прадугледжвалася стварэнне Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Зарукай поспеху ў гэтай справе было ўспадкаванне найлепшых савецкіх практык і падыходаў да аховы помнікаў, а таксама вялікі попыт, які існаваў у тагачасным грамадстве на спазнанне ўласнай гісторыі.

Аб складанні і структуры Дзяржаўнага спіса распавёў кансультант аддзела арганізацыі аховы і ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Генадзь Ходар, які сёння па сваіх службовых абавязках займаецца вядзеннем гэтага дакумента. Цікава, што пэўны час паралельна з Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь дзейнічалі таксама зацверджаны ў 1984 Збор помнікаў гісторыі Беларусі і створаны ў 1988 годзе Спіс помнікаў гісторыі і культуры рэспубліканскага значэння. Пасля адмены гэтых дакументаў пры ўніфікацыі заканадаўства ў 2001 — 2003 гадах, усе аб'екты з іх былі аўтаматычна перанесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, за кошт чаго менавіта ў той перыяд колькасна ён вырас найбольш істотным чынам — з 376 да 4326 аб'ектаў.

## СПІС, ЯКІ РАСЦЕ НЯСПЫННА

Наогул жа гісторыя аховы спадчыны ў Беларусі сягае яшчэ міжваеннага перыяду, калі ў 1923 годзе была прынятая пастанова ўрада БССР "Аб рэгістрацыі, узяцці на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, старадаўнасці, быту і мясцовасцяў прыроды". А ў пэўныя перыяды незалежнай Беларусі ў нашай краіне існавалі і адмысловыя органы ўлады, упаўнаважаныя на ахову помнікаў — Дзяржаўная інспекцыя Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 1992 — 1996, Камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 1996 — 2001, і Дэпартамент па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 2001 — 2004 гадах. Цяпер жа гэтыя функцыі, узятыя на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, старадаўнасці, быту і мясцовасцяў прыроды, ўскладзеныя на Міністэрства культуры.

Па стане на 2020 год Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў налічвае 5587 аб'ектаў спадчыны. Найвялікшай катэгорыяй сярод іх з'яўляюцца помнікі археалогіі — яны складаюць 40 адсоткаў спіса. На другім месцы — помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва (32 адсотка), і замыкаюць тройку помнікі гісторыі (22 адсотка). На помнікі мастацтва і запаведныя мясціны, рухомыя помнікі і нематэрыяльныя каштоўнасці прыпадаюць адпаведна 1, 2 і 3 адсотка.

Важна разумець, што Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў уключае далёка не ўсе аб'екты культурнай спадчыны, лік якіх ідзе на мільёны — але многія з іх прадстаўленыя ў іншых уліковых дакументах, такіх, як рэестры археалагічных аб'ектаў, рэгістры воінскіх пахаванняў і гэтак далей. Таксама варта ўлічваць, што ў складзе некаторых гісторыка-культурных каштоўнасцяў, унесеных у спіс, могуць знаходзіцца асобныя аб'екты — так, у склад адзінаццаці помнікаў горадабудаўніцтва, якімі з'яўляюцца гістарычныя цэнтры шэрагу беларускіх гарадоў, уваходзяць звыш 900 аб'ектаў спадчыны — таму агульная колькасць іх, з улікам такіх комплексаў, дасягае ажно пятнаццаці тысяч.

У залежнасці ад катэгорыі, гісторыка-культурныя каштоўнасці падзяляюцца на аб'екты сусветнага значэння (17), міжнароднага (94), нацыянальнага (636) і рэгіянальнага (4699). Дарэчы, ужо створаны і ў найбліжэйшы час стане даступным новы сайт, на якім Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў будзе прадстаўлены з магчымасцю пошуку па розных крытэрыях: шыфру, назве, датаванні, месцазнаходжанні, катэгорыі культуры запэўнілі, што работа па інфармаванні зацікаўленых прадстаўнікоў грамадства аб метадах уліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў і парадку падрыхтоўкі прапановаў на наданне ахоўнага статусу будзе актывізаваная.

**Фальварак Мураванка ля аграгарадка Шчорсы Навагрудскага раёна — адзін з многіх помнікаў, аб захаванні і добраўпарадкаванні якога сёння клапоціцца не толькі дзяржава, але і мясцовая супольнасць.**

## ЯК НЕ ЗГУБІЦЬ УЛІЧАНЫЯ СКАРБЫ

Асобная секцыя канферэнцыі была прысвечаная пытанням уліку нематэрыяльнай спадчыны, якія выклікаюць сёння ў нашай краіне, як і па ўсім свеце, усё большую зацікаўленасць. Супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Таццяна Мармыш звярнула ўвагу на дваісты ўплыў надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці на захаванне розных відаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Уключэнне ў Дзяржаўны спіс пэўных рамёстваў ці абрадаў можа як спрыяць іх захаванню, так і, парадакс, што значна аблегчыць работу са спісам і зробіць яго больш адкрытым і зразумелым для ўсіх.

Звяртае на сябе ўвагу той факт, што за апошнія гады, з моманту ўступлення ў сілу Кодэкса аб культуры ў 2017 годзе, усе прапановы аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці былі ўнесеныя дзяржаўнымі органамі і ўстановамі, а не грамадскімі арганізацыямі, і выклікана гэта, не ў апошнюю чаргу, недастатковай прававой падрыхтаванасцю ў гэтай сферы. Прадстаўнікі Міністэрства культуры запэўнілі, што работа па інфармаванні зацікаўленых прадстаўнікоў грамадства аб метадах уліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў і парадку падрыхтоўкі прапановаў на наданне ахоўнага статусу будзе актывізаваная.

Так, атрыманне статусу спрыяе папулярызацыі таго ці іншага элемента, а значыць, ён можа выйсці за рамкі ўласцівых яму гістарычнай супольнасці і мясціны распаўсюджання, а такая змена кантэксту можа пагражаць фалькларызацыяй, прафанізацыяй і камерцыялізацыяй спадчыны. Таксама часам назіраецца неапраўданая канкурэнцыя паміж рэгіёнамі, якія спаборнічаюць між сабой у падачы як мага большай колькасці заявак на наданне статусу нематэрыяльнай каштоўнасці, не заўсёды дбаючы аб дакладнасці звестак — прапаноўваюцца элементы, распаўсюджанасць якіх на сённяшні дзень выклікае сумневы.

Вядучы спецыяліст Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алена Каліноўская звярнула ўвагу на тое, што атрыманне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці пэўным элементам нематэрыяльнай спадчыны па-рознаму ўплывае на тыя ці іншыя яе віды. Так, напрыклад, атрыманне ахоўнага статусу істотна паспрыяла папулярызацыі такога малавядомага раней элементу, як лясное бортніцтва — нават сярод навуковай супольнасці факт захавання і распаўсюджанасці гэтага промыслу ў Лельчыцкім раёне быў для многіх таямніцай. Тое ж можна сказаць і аб распаўсюджанасці інсітнага мастацтва ў Віцебскай вобласці — хаця гістарычныя традыцыі гэтай з'явы ў мінулым стагоддзі былі даволі вядомыя, але мала хто яшчэ нядаўна ўяўляў, што яна так шырока пашыраная і ў нашыя дні: больш за сорак майстроў удзельнічаюць не толькі ў абласных, але і ў нацыянальных ды міжнародных выставах.

Але ёсць, на жаль, і такія элементы, у выпадку з якімі атрыманне ахоўнага статусу не заўжды гарантуе паляпшэнне сітуацыі. Так часта адбываецца з народнымі майстрамі, якія маюць талент, але пераняць яго няма каму. Таму важна, каб пры падачы прапановы аб наданні статусу ўлічвалася пераемнасць майстэрства. Тое ж тычыцца і традыцыйных цырымоній ды абрадаў, многія з якіх звязаныя з рэлігійнымі практыкамі — а паколькі сучасныя хрысціянскія практыкі ўніфікуюцца, то мясцовыя асаблівасці знікаюць.

## БУДУЧЫНЯ СПАДЧЫНЫ

Абмеркаванне дакладаў засведчыла, што грамадскасць разам з дзяржаўнымі органамі кіравання здольныя эфектыўна вырашаць праблемы захавання спадчыны і знаходзіць шляхі паляпшэння заканадаўства ў гэтай галіне. Практыка паказвае, што з часам з'яўляюцца і звяртаюць на сябе ўвагу новыя катэгорыі спадчыны, заўважныя сёння ў значна большай ступені, чым раней — сярод такіх нематэрыяльная і нават лічбавая спадчына, помнікі архітэктуры савецкага мадэрнізму альбо індустрыяльная спадчына, комплексныя культурныя ландшафты. А такія катэгорыі каштоўнасцяў, відавочна, будуць патрабаваць новых падыходаў да работы з імі.

Арганізатары адзначаюць, што ў сучасным свеце важным складнікам стаўлення да гісторыка-культурнай спадчыны пачынае рабіцца не толькі яе захаванне і рэстаўрацыя, але, не ў апошнюю чаргу, і выкарыстанне з удзелам зацікаўленых бакоў: мясцовых, прафесійных, нацыянальных супольнасцяў. Усё большую ролю ў вызначэнні лёсу спадчыны набываюць грамадскія арганізацыі, якія сёння ўжо гатовыя не проста заклікаць аб дапамозе ці пратэставаць супраць разбурэння помнікаў, але і самастойна ўдзельнічаць у іх захаванні і выкарыстанні, плённа супрацоўнічаючы з дзяржаўнымі органамі ўсіх узроўняў.

К

# Розныя дыпломы аднолькавага ўзору

**Лічыцца, што перадумовай узнікнення дызайну стаў масавы пераход ад ручной працы да машыннай, ад мануфактуры да фабрыкі, што адбыўся ў XVIII — XIX стагоддзях і быў названы "індустрыяльнальнай рэвалюцыяй". Зразумела, што тыражаваная прадукцыя зыходна саступала па функцыянальных і эстэтычных якасцях тым рэчам, якія рамеснікі рабілі ў адзінкавым экзэмпляры. Прычым саступала значна. Яно і сёння так: самаход ручной зборкі і сабраны на канвееры — гэта два розныя самаходы. Дзейнасць, накіраваная на пераадоленне гэтай прорвы, паступова ператварылася ў тое, што мы сёння называем дызайнам.**

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Доўгі час і самі дызайнеры ў сённяшнім разуменні гэтай прафесіі былі на рынку паслуг свайго роду "штучным таварам", нават калі была створана сістэма адпаведнай адукацыі — а значыць і ратацыі / "тыражавання" кадраў. Тым больш, так было ў нашай краіне, дзе само паняцце "мастак-канструктар" (сэнсавы пераклад англійскага слова "дызайнер") з'явілася толькі ў 1960-х гадах. Я заспеў час, калі ВНУ, дзе рыхтавалі "мастакоў-канструктараў", у вялікай краіне было няшмат. Ды і функцыі гэтых прафесіяналаў у структуры прамысловасці, у іншых сферах сацыяльнай практыкі бачыліся не так, як сёння — канкрэтнымі і вузкаспецыялізаванымі. Дызайнеры мусілі быць гатовымі да ўсяго і ўмець усё! І сапраўды, тагачасная творчая моладзь, што абрала дызайн як прафесію, не заўсёды маючы глыбінныя веды ў канкрэтных сферах, някепска арыентавалася шмат у якіх справах — ад інжынернай і сацыяльнай псіхалогіі ў спалучэнні з эрганомікай да прынцыпаў фарміравання стылю і асноў маркетынгу... Адзін наш выкладчык, які ставіўся да студэнтаў даволі ліберальна, казаў: "Вы не можаце трымаць у галаве ўсю інфармацыю, якая калі-нікалі спатрэбіцца, але вы павінны ведаць дзе, у якім даведніку яе пры нагодзе можна хутка знайсці". Ужо тады, у 70-я гады, нашы навучальныя праграмы, гаворачы сучаснай мовай, былі "продвинутые" ў параўнанні з традыцыйнымі, па якіх вучылі мастацтву выяўленчаму. Адно што ва ўмовах тагачаснай эканомікі ў такіх маладых спецыялістаў пасля заканчэння ВНУ часта не было ні матывацыі, ні стымулу не тое, што максімальна выкладвацца на працы, а нават проста дэманстраваць руплівасць. Але ўжо іншая тэма.

Сёння ў Беларусі ў ВНУ, каледжах і на разнастайных курсах дызайнераў рыхтуюць болей, чым калісьці ва ўсім Савецкім Саюзе. Прафесія з катэгорыі "адзінкавых" трапіла ў "тыражаваныя". І як я згадваў напачатку нататкаў, пераход ад эксклюзіву да тыражу аплочваецца, прынамсі, на першым этапе, стратай станоўчых якасцяў. Мне даводзілася быць рэцэнзентам у шэрагу сталічных ВНУ пры абароне дыпломных работ па дызайне. Вось і сёлета я рэцэнзаваў такія дыпломы ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і ў адным ВНУ, дзе ёсць кафедра дызайну. Адпаведна меў магчымасць параўноўваць ступень падрыхтаванасці спецыялістаў у гэтых навучальных установах. На жаль, я вымушаны канстатаваць, што хоць выхаванцы абодвух ВНУ атрымалі дыпломы як сведчанне кваліфікацыі аднолькавага дзяржаўнага ўзору, розняцца яны як самаход, што сышоў з канвеера, ад самаходу эксклюзіўнай зборкі. Вонкава, можа, адно і тое ж, але перавагі вызначаюцца ў часе эксплуатацыі. Зразумела, што параўнанне на карысць БДАМ.

Прычын на тое некалькі. У БДАМ вышэй планка патрабаванняў да абітурыента. Значыць, выпадковыя людзі адсейваюцца яшчэ на стадыі прыёму дакументаў. Хоць навучанне дызайнераў у Акадэміі скіравана за засваенне сучасных тэхналогій, вялікая ўвага па-ранейшаму надаецца традыйным малюнку і жывапісу. А, як вядома, хто лепей малюе, той і камп'ютар хутчэй засвойвае.

І, бадай, самае галоўнае. З Акадэміі студэнта могуць адлічыць на любым курсе, калі ён не выконвае навучальную праграму. Не зважаючы на тое, вучыцца ён на бюджэтнай аснове ці сам аплочвае сваё навучанне. Выдаткоўвае на студэнта сродкі дзяржава ў спадзяванні на іх вяртанне пасля таго, як малады спецыяліст пачне працаваць, або сам студэнт нясе грошы ў касу ВНУ — значэнне не мае. Акадэмія дбае пра свой прэстыж і не дапускае, каб яе дыплом трапіў у рукі недавука, непрафесіянала.

Выкладчык Акадэміі Маргарыта Шчамялёва, дачка славутага мастака і сама выдатны прафесіянал дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва згадвала мне пра сваю студэнтку, якая сама аплочвала сваё навучэнне і з гэтай прычыны лічыла сябе недатыкальнай. Была адлічана за неруплівасць. Засвоіла гэты ўрок, праз год была адноўлена ў Акадэміі. Паспяхова абаранілася. Дарэчы, платнік, які добра вучыцца, мае шанцы перавесціся на бюджэтную форму навучання. "Я, — кажа Маргарыта Леанідаўна,— тлумачу сваім студэнтам, што галоўнае не ацэнка, якую ты атрымаў на тым ці іншым праглядзе. Будзеш працаваць і выправіш кепскую ацэнку на добрую. Галоўнае — прынцыпова вызначыцца, хочаш ты быць мастаком ці не".

Не буду канкрэтызаваць, але ў іншых ВНУ, дзе ёсць кафедры дызайну, не заўжды праяўляецца такая прынцыповасць. На тое свае прычыны, якія звычайна навідавоку, а значыць мне няма патрэбы на іх засяроджвацца. Зрэшты, потым жыццё ўсё расстаўляе па сваіх месцах, разводзіць па розных палюсах тых, каму проста быў патрэбны дыплом, і тых, хто насамрэч вырашыў быць мастаком, дызайнерам — творцам, інакш кажучы. Але і выкладчык мусіць дапамагаць абітурыенту ці студэнту вызначыцца па жыцці. Зрабіць так, каб той не марнаваў маладосць на бесперспектыўныя заняткі, каб, гаворачы словамі савецкага класіка, "не было мучительно больно за бесцельно прожитые годы". "Тыраж" мабыць таксама для чагосьці патрэбны, але ўсё ж лепей арыентавацца на эксклюзіў. Хай менш, але вышэйшага гатунку.

**На фотаздымках — эксклюзіў ад Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: абарона дыпломных работ факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кафедры ДПМ і касцюма.**

# Яе “самыя-самыя” ролі. І жыццё

**Гэту статную, зграбную, абаяльную прыгажуню ведаюць ледзь не ўсе ў Бабруйску. Жанэта ЗАРЭМБА, адна са старэйшых актрыс Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча справіла свой юбілей. Праз некалькі месяцаў яе чакае яшчэ адна значная дата — 50 гадоў на сцэне роднага тэатра. Пра свой лёс актрыса распавяла ў нашай з ёй гутарцы.**

Жанэта Зарэмба.

**— Жанэта Канстанцінаўна, ваша дзяцінства прыпала на вайну. Штосьці памятаеце з таго часу?**

— Такое не забываецца. Калі пачалася Вялікая Айчынная, мне быў усяго годзік... А я шмат чаго памятаю! Першая “карцінка” — многа-многа народу, свеціць сонца і чамусьці грыміць гром. Толькі гэта была не навальніца, а бамбёжка. І маці са мной на руках уцякала з Мінску, які пачалі бамбіць. Яшчэ адзін дзіцячы ўспамін — як высока боўталіся дзве лялькі, мужчынская ў вайсковай форме і жаночая. Боўталіся, біліся адна аб адну, а маці ўсё адварочвала мой твар. Бо я тады не ведала, што такое шыбеніца. Уцяклі мы недалёка, усю вайну жылі ў вёсцы блізу Лагойска, у роднай цёткі. Тая была звязана з партызанамі, яны прыходзілі ўночы. А днём завітвалі немцы. Я ведала, што мой тата змагаецца “за Родину, за Сталина”, вельмі ганарылася гэтым. І аднойчы шчыра і горача “пахвалілася” немцам. Выратавала нас толькі тое, што немец, які добра ведаў рускую мову, растлумачыў астатнім усё наадварот, супакоіў іх. Ну, а потым, як іншыя сышлі, выказаў маёй маці ўсе свае “меркаванні” па гэтым пытанні.

**— Вайна стала першай цаглінкай у вашым характары. А пасляваенны час?**

— Вызваленне Беларусі супала з маім першым каханнем: у чатыры гады я сур’ёзна “ закахалася” ў 12-гадовага суседа Пецьку і горача адстойвала сваё каханне перад дарослымі. Мне пашанцавала: бацька вярнуўся. Але я бясконца потым гуляла ў вайну са сваімі братамі, расла гэткай “бандыткай”, як мяне называлі. Маім кумірам была Зоя Касмадзям’янская, і я імкнулася выхаваць у сабе стойкасць — самымі рознымі спосабамі. Гэта таксама пакінула свой след, садзейнічала станаўленню характару. І вельмі прыдалося потым у прафесіі.

**— Любоў да тэатра з’явілася з маленства?**

— Гадоў у восем — дзевяць. Мы на той час жылі ў Маладзечне, там свайго тэатра тады не было, але на гастролі прыехала трупа з Калінінграда. Усё, як звычайна: зранку — казка для дзяцей, увечары — спектакль для дарослых. Мяне, зразумела, адвялі на раніцнік. Убачанае так мяне ўразіла так, што ўвечары я вырашыла абавязкова зноў патрапіць у тэатр. Самастойна! Квітка, вядома, не было, таму я рушыла... праз акно. І пралезла-такі ў залу! На ўсё жыццё запомнілася тое ўражанне ад умення артыстаў пераўвасабляцца. Для мяне было проста неспасціжным, як так атрымліваецца: раніцай ты — прынцэса, а ўвечары — салдатка. Захацелася і самой гэтак жа!

Грэта (“Асцярожна, цёткі!”).

**— Пэўна, дома ўпотай пераапраналіся і рэпеціравалі.**

— Чаму ж толькі дома? У школе ў нас таксама ставілі невялічкія сцэнкі. У пятым класе, да прыкладу, мне даручылі сыграць хлопчыка, якому здрадзіла любая дзяўчынка. Я так увайшла ў гэтую ролю, што калі ўявіла сабе, што ён мог адчуваць, дык і сапраўды заплакала. Такога я і сама не чакала, мяне гэта папросту агаломшыла! Чым далей, тым больш разумею, што ў жыцці кожнаму з нас даюцца лёсавызначальныя знакі, толькі не ўсе іх заўважаюць. А тыя слёзы і былі знакам: я адчула сябе артысткай. І як упэўнілася, што іншага шляху для мяне няма, дык вырашыла паступаць у тэатральны інстытут. Праўда, бацькі былі супраць: хацелі для мяне нейкай больш, так бы мовіць, “адчувальна трывалай” спецыяльнасці. Гэта можна зразумець. Бацька ж быў вайскоўцам, мы часта пераязджалі: куды яго пашлюць — туды і мы за ім. Аб’ездзілі ўсю Беларусь, жылі ў Расіі, Украіне. Затое ў мяне яшчэ з тых часоў з’явілася цяга да падарожжаў. А па савецкіх часах якія маглі быць паездкі? Затое тэатр такую магчымасць даваў. Выязджалі ўсім калектывам і на ўсё лета. Геаграфія гастроляў была вельмі шырокай — але, вядома, па Савецкім Саюзе. А мне заўсёды хацелася пабываць у Індыі і Японіі. Чаму? Нават не ведаю, адкуль такая цікаўнасць.

**— Затое я, здаецца, ведаю: вам увогуле ўсё цікава! Асабліва штосьці для вас новае, невядомае. Узяць той жа камп’ютар — вы ж вунь як у ім разбіраецеся!**

— Калі што не ведаю, да моладзі звяртаюся. Чаму б і не? Я люблю вучыцца, яшчэ са школы гэта захавалася. Вучыцца, спазнаваць штосьці новае для мяне — адно задавальненне.

**— На артыстку таксама было цікава вучыцца?**

— Канешне! Я ж трапіла на курс цудоўнага педагога, прафесара Дзмітрыя Арлова, які выхаваў суцэльны шэраг знакамітых беларускіх артыстаў. Сярод маіх аднакурснікаў былі Андрэй Андросік, Валерый Анісенка, Наталля Чамадурава, Леанід Улашчанка, Святлана Некіпелава, Кацярына Доўнар, Аляксандр Курловіч. Успамінаў пра той малады, яшчэ бесклапотны і такі палётны час засталося шмат. Інстытут даў мне веды, заклаў падмурак прафесіі, у мяне з’явілася ўпэўненасць у сваіх сілах, жаданне працаваць, працаваць, працаваць... Планаў, мар, спадзяванняў было безліч! Але ж я потым яшчэ адну вышэйшую адукацыю атрымала: скончыла інстытут тэатра, музыкі і кінематаграфіі ў Ленінградзе па спецыяльнасці “Эканоміка, арганізацыя тэатра”.

**— Дык вось адкуль у вас уменне арганізаваць усіх і ўсё! Маю на ўвазе вашу выкладчыцкую дзейнасць, грамадскія справы па-за сценамі тэатра.**

— Мне прыемна дзяліцца сваімі ведамі, вопытам. Я з вялікім задавальненнем гатова навучыць кожнага таму, што ўмею, у чым добра разбіраюся. Нагэўна, з-за таго да мяне часта звяртаюцца з просьбай дапамагчы ў падрыхтоўцы да паступлення ў тэатральныя навучальныя ўстановы. Некалькі гадоў выкладала сцэнічную мову ў Бабруйскім каледжы мастацтваў, доўгі час займалася тэатральнай студыяй у нядзельнай школе Свята-Георгіеўскага храма. Заўжды з радасцю прымаю ўдзел у шматлікіх гарадскіх мерапрыемствах, канцэртах, творчых сустрэчах. Мне проста неабходна дзяліцца тым, чым багатая, усім тым, што ў мяне ў душы. Бо калі чалавек дзеліцца, абавязкова атрымлівае ўдвая.

**— Гэта ваш жыццёвы дэвіз?**

— Так здарылася, што ў мяне іх некалькі. Змоладу кіравалася словамі Мікалая Забалоцкага: “Не позволяй душе лениться!” А цяпер ужо душа “прывучана”, таму жыццёвы дэвіз крыху іншы, гэта словы беларускай паэткі Валянціны Паліканінай: “Не сдавайся времени, душа!”, і яны гавораць самі за сябе.

**— Яшчэ як гавораць! Ці многа можна назваць тых, хто ў 80 гадоў, маючы ў творчым багажы безліч галоўных роляў, з задавальненнем, пераканаўча выконвае і ролю разумніцы Пчалы ў “Мухе-Цакатухе”!**

— Я люблю ўсе свае ролі, з цікаўнасцю бяруся за любую. Бо ў кожнай, нават невялічкай можна адшукаць “разыначку”, якая ўпрыгожыць гераіню, зробіць яе жывой, надасць рысы індывідуальнасці. І вельмі шкадую, што за столькі гадоў служэння тэатру не давялося сыграць у п’есах любімага аўтара — Чэхава. Спачатку я працавала ў тэатры ў Брэсце, потым ным характарам загнала ўсе свае жарсці і любоў да дачок у самы куточак зацвярдзелага сэрца, якое проста не вытрымала. Яшчэ адна роля — Люсі з драмы “Далей — цішыня” Віны Дэльмар, дзе сэрца, поўнае любові, сутыкаецца са здрадай. Ролі ў спектаклях паводле Астроўскага: “Свеціць, ды не грэе”, “Бяздонне”, “Лес”. Бо ў гэтага аўтара кожная роля, нават невялікая, — гэта заўсёды гісторыя пра чалавека, цікавая і зразумелая публіцы. Убачыўшы штосьці ўласцівае сабе самому, глядач спрабуе разабрацца ў гэтым, прааналізаваць. На жаль, цяпер тэатр шмат у чым страціў сваю значнасць. Не толькі ў нас — па ўсім свеце. Адміністрацыі лягчэй прадаць квіткі на забаўляльныя спектаклі, але ж нам з шоу-бізнесам не зраўняцца. Ды і немагчыма чалавеку ўвесь час толькі смяяцца! Я шчаслівая, што мне давялося іграць у спектаклях, якія будзяць у чалавеку — чалавечае, адгараваюць сэрцы, напаўняюць іх любоўю. Тэатр дзеля гэтага і існуе. Таму часцяком я сама прапаноўваю п’есы. Напрыклад, згаданая драма “Далей — цішыня”, камедыя “Асцярожна! Цёткі!” Аляксандра Кароўкіна, монаспектакль “Заступніца” паводле Юрыя Нагібіна, дзе я сыграла бабулю Лермантава.

Пчала (“Муха-Цакатуха”).

Жанэта Зарэмба чытае вершы.

**— З гэтай пастаноўкай вы сталі лаўрэатам на Міжнародным фестывалі монаспектакляў. Увогуле ж, узнагарод у вас — не злічыць. У працоўнай кніжцы зроблена столькі запісаў аб вынесеных вам удзячнасцях, што старонак не стае. Дыпломы, ганаровыя граматы, падзяка міністра культуры Рэспублікі Беларусь, “Крыштальная зорка” Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. Нарэшце, медаль Святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай ад Беларускай праваслаўнай царквы.**

— Мой зварот да веры пачаўся з простых паломніцкіх паездак, якімі рухала эстэтычная цікаўнасць. А потым здарыўся нейкі цуд: я прачнулася, зірнула ў акно, дзе былі ўсяго толькі шэрыя гарадскія шматпавярхоўкі, і раптам адчула, зразумела, які цудоўны свет, як хораша Бог усё зладзіў! Галоўная ўзнагарода — не толькі прызнанне, павага, але і цеплыня, шчырасць чалавечых адносін. Гэтае нічым не заменіш! І любоў — у самым шырокім сэнсе слова, да ўсяго на зямлі. Люблю жывёл, срэбра, самацветы. Люблю чытаць, разважаць, гуляць ля Беразіны, вывязваць прыгожыя рэчы, насіць капялюшыкі, хадзіць на выставы, сустракацца і размаўляць з людзьмі. Жыць — неверагодна цікава!

**Ала ГРАХАВА,**
**артыстка, загадчыца літаратурна-драматургічнай часткі Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча**

Фота з архіва тэатра

# Голуб на постары як Паходня Дабрыні

*Беларуская анімацыя — у конкурсе фестывалю ў Хірасіме*

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

**Магчыма, шаноўны чытач памятае шэрага дабрака з мультфільма "Лагодны воўк" Наталіі Хаткевіч-Дарвінай, што скарыў публіку і журы на "Лістападзе — 2018"? Або кранальную гісторыю пра Хлопчыка, які праз сілу музыкі вярнуў свайго бацьку з вайны — анімацыйную карціну "Паданне пра гуслі" Таццяны Кубліцкай? У нас пра іх выдатныя звесткі: дзве гэтыя стужкі, створаныя на Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", трапілі ў конкурс прэстыжнага міжнароднага фестывалю анімацыйнага кіно ў Хірасіме.**
**Як паведамляецца на сайце кінафоруму: фільмы беларускіх кінематаграфістаў былі адабраныя з больш як 2 300 заявак, якія прыйшлі на анімацыйны агляд з 84 краін свету, і трапілі ў лік 59 конкурсных работ.**

Некалькі слоў пра саму падзею. Міжнародны фестываль анімацыйнага кіно ў Хірасіме — адзін з вядомых форумаў анімацыі ў свеце, і ладзіцца на востраве Хонсю з 1985 года. Яго пасланне - "Любоў і мір" — нарадзілася з трагічных старонак гісторыі горада, і, як падкрэсліваюць стваральнікі форуму, мэта міжнароднага агляду — садзейнічанне культурнаму паразуменню праз развіццё анімацыйнага мастацтва. Візуальныя медыя ў канцэпцыі японскага фестывалю — тая мова, што можа быць зразумелай і выкшталцонай адначасова. Конкурс, які складаецца з чатырох блокаў, разнастайныя праграмы, што ўключаюць рэтраспектывы майстроў, іграваю анімацыю, анімацыю студэнтаў, для дзяцей, а таксама адмысловыя прызы — усё гэта робіць фестываль у Хірасіме заўважным у свеце. Ужо само траплянне ў яго конкурсную праграму можна лічыць своеасаблівым прызнаннем майстэрства кінематаграфістаў.

"Паданне пра гуслі".

І яно, прызнанне, варта дадаць, не абмінула адабраныя ў конкурс беларускія работы. Карціны Наталіі Хаткевіч-Дарвінай і Таццяны Кубліцкай ужо маюць прыстойную фестывальную гісторыю: Польшча, Расія, Македонія, Кітай, вядома, Беларусь, — стужкі былі заўважаны на многіх аглядах. У прыватнасці, "Лагодны воўк" Наталіі Хаткевіч-Дарвінай, які, нагадаем, пра ваўка, які не мог з'есці нават і барашка, быў прызнаны лепшым анімацыйным фільмам на мінскім міжнародным фестывалі ў 2018 годзе. "Паданне пра гуслі" Таццяны Кубліцкай, заснаваны на прыгожай аўтарскай фантазіі пра старажытны музычны інструмент, на леташнім "Лістападзе" трапіў у лік фаварытаў форуму. Як адзначылі крытыкі, "Паданне..." трапна перадало сутнасць беларускага характару, у каштоўнасцях якога — жыццё блізкіх, мужнасць у імя міру. У цэлым, дзве гэтыя стужкі, што трапілі ў пасланне фестывалю ў Хірасіме, аб'ядноўваюць Дабрыня, перад якой бяссільныя і стрэльба, і дзіда.

Паразважаць пра пасланне сваёй карціны, і каштоўнасці, важныя для ўсяго свету, мы і папрасілі аўтараў згаданых работ.

■■■

— Сцэнарый да сваёй стужкі я пісала сама, — прызнаецца Таццяна Кубліцкая. — Доўга выбудоўвала сюжэт, успамінаючы і класічныя казачныя каноны, і творы Уладзіміра Караткевіча, і беларускія легенды, і шматвекавую гісторыю беларускай зямлі, і гісторыю майго бацькі, які ў 12 гадоў застаўся галоўным у сям'і.

Хлопчык робіць з ваярскага шчыта і цецівы з лука музычны інструмент — гуслі, каб прымірыць гатовых да бітвы воінаў, і вярнуць дадому свайго бацьку. У славянскіх мовах "гуслай" называлі цеціву лука. Зброя ператвараецца ў музычны інструмент, з дапамогай чароўнай мелодыі якога воіны ўспамінаюць сваіх родных і пераадольваюць варожасць адзін да аднаго.

Гэта прытча пра мір і агульначалавечыя каштоўнасці, якія нас аб'ядноўваюць.

■■■

— Сучасны свет мае вялікую патрэбу ў дабрыні, — падтрымлівае калегу Наталія Хаткевіч-Дарвіна. — Ён задыхаецца ад злосці. І павінна быць такое кіно, пасля якога хочацца стаць лепшым, хочацца жыць. Часам у падобным важным фільме галоўны герой нават можа прайграць, захварэць (у нашым выпадку ўсё закончылася добра), — але гэта толькі сродак, які выкарыстоўвае аўтар, каб "пабудзіць" і натхніць гледача. Я магу тут у якасці прыкладу ўзгадаць вершы Іосіфа Бродскага, фільмы Андрэя Таркоўскага. Дужа важна даць людзям адчуць, што галоўнае — любоў і дапамога адзін адному.

Нагадаем, што стужка "Лагодны воўк" створана па аднайменнаму твору Алены Масла. Наталія Хаткевіч-Дарвіна ўпэўнена, што яскравага і запамінальнага персанажа, які скарыў сэрцы ўжо многіх, зразумеюць і палюбяць і ў Хірасіме.

— Хто такі наш герой? — перапытвае яна. — На месцы нашага ваўка можа быць любы чалавек. Той, хто адрозніваецца, хто пакінуты, хто недзе спатыкнуўся. Ён вось такі дзівак, а пакрыўдзіць іншага не можа. Мне хацелася зрабіць такую стужку, якая закране кожнага і будзе несці святло, — дадае Наталія. — І спадзяюся, што ў гэтай гісторыі будзе працяг.

Застаецца паведаміць, што 18-ты Міжнародны фестываль анімацыйнага кіно ў Хірасіме пройдзе з 20 па 24 жніўня. Пандэмія ўсё ж унесла карэктывы ў яго праграму: кінафорум адбудзецца ў абмежаваным фармаце, але арганізатары абяцаюць зладзіць паказы фільмаў-пераможцаў для гледача ў інтэрнэце.

Цікавая дэталь: сёлета ганаровым прэзідэнтам агляду абраны вядомы расійскі аніматар, уладальнік "Оскара", Аляксандр Пятроў.

На афіцыйным постары фестывалю гэтага года выяўлены голуб, што нясе на сваёй спіне хлопчыка і дзяўчынку.

**P.S.** ***Пакуль рыхтаваўся нумар, прыйшла добрая навіна. У праграме кінафоруму прыме ўдзел яшчэ адна стужка Наталіі Хаткевіч-Дарвінай "Прыгажун і пачвара". Яна будзе паказана ў праграме "Анімацыя для дзяцей". Віншуем каманду фільма!***

К

"Лагодны воўк".

Кадры з фільмаў прадастаўлены Таццянай Кубліцкай і Наталіяй Хаткевіч-Дарвінай.

КУЛЬТУРА WWW.KIMPRESS.BY № 26 / 27 ЧЭРВЕНЯ 2020 г.

Прэм'ера балета "Пер Гюнт" у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі прызначана на пачатак сезона — 8 і 9 верасня. Але перадпаказ для прэсы і здача спектакля мастацкаму савету тэатра адбылася перад сыходам артыстаў у адпачынак — 24 чэрвеня.

# Ібсен і крыху містыкі

Надзея БУНЦЭВІЧ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Не толькі рэпетыцыі, але і сам генеральны прагон праходзілі ў незвычайных умовах. На большасці артыстаў — маскі, якія адным персанажам надавалі яшчэ больш "рэалізму", гэткай набліжанасці да сучасных рэалій, другім — наадварот, містыцызму: якніяк, там і тролі дзейнічаюць, і іншыя міфічныя істоты. Маскі — і на артыстах аркестра (за выключэннем духавікоў, зразумела). Дырыжор Аляксандр Анісімаў прыдумаў "ноу-хау": частку струнных увогуле рассадзіў у глядзельнай зале — у праходзе паміж сцэнай і першым шэрагам крэслаў. Бо ў аркестравай яме, хаця яна ў нашым тэатры і не маленькая, вытрымаць дыстанцыю немагчыма.

"Артысты здзейснілі подзвіг!" — такія словы гучалі пасля прагляду неадпочны, стаўшы своеасаблівым лейтматывам абмеркаванняў. Усе горача віталі харэографа Сяргея Мікеля і іншых удзельнікаў пастаноўкі. Асобна віншавалі народную артыстку Беларусі, мастацкага кіраўніка Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа Інэсу Душкевіч, якая прыйшла на прагляд у свой дзень нарадзінаў. А Людміла Бржазоўская прызналася, што Сольвейг была яе першай сольнай партыяй у нашым тэатры: яна танцавала яе ў колішнім аднайменным, але зусім іншым балеце 1960-х гадоў, які ставіў Атар Дадзішкіліяні паводле ўсё той жа драмы Генрыха Ібсена.

К

# Задумацца хоць на секунду

Прэм'ера

**У ДУК "Слонімскі драматычны тэатр" адбылася прэм'ера спектакля "Белы ліст" па п'есе вядомага беларускага пісьменніка і драматурга, гамяльчаніна Васіля Ткачова. Ажыццяўіў пастаноўку галоўны рэжысёр тэатра Васіль Сявец. У спектаклі занята ўся трупа.**

...У адным невялікім гарадку застаўся апошні франтавік Іван Мітрафанавіч Асокін (Уладзімір Навумік). Пра гэта зусім выпадкова даведалася кіраўніцтва. Старшыня мясцовага райвыканкама Сяргей Кулакоў (Ігар Макараў) памяркоўна-летуценна кажа сваёй падначаленай Веры Міхайлаўне (Ірына Яцук) напачатку дзеі: "Што ж атрымліваецца, а? Заўтра ў вобласці... паслязаўтра ў краіне застанецца адзін... А сапраўды, шаноўная Вера Міхайлаўна, гэты ж час павінен некалі надысці... калі будзе апошні франтавік і ў краіне... А мы жывём і не думаем пра гэта... "

І каб неяк аддзячыць апошняму ветэрану вайны, мясцовыя ўлады даюць яму чысты ліст паперы: прасі, пажадай, усё, што хочаш. Дадзім. Ты - заслужыў. І што ж папрасіў франтавік?

Пра гэта, а таксама пра адносіны дзяцей і бацькоў, пра павагу моладзі да старэйшага пакалення і ідэе гаворка ў спектаклі Слонімскага драматычнага тэатра "Белы ліст". Трэба адзначыць, што гэта не першае ўвасабленне п'есы Васіля Ткачова на тэатральнай сцэне. Раней яна пабачыла святло рампы ў Магілёўскім абласным драмтэатры, у тэатры Усходняй вайсковай акругі (г. Усурыйск) і ў драмтэатры САНТ (г. Актау, Казахстан).

На сайце драматурга Васіля Ткачова мяне зацікавілі наступныя радкі, якія дасла-ла яму Анжаліка Кузьмянок, вучаніца 10 класа аднаго з магілёўскіх ліцэяў: "Ніхто з гледачоў не застаўся абыякавым: п'еса кранула ліцэістаў да глыбіні душы. У канцы пастаноўкі плакалі ўсе, некаторыя, праўда, стараліся гэта схаваць. Меладрама ўзнімае такія надзённыя для сучаснага грамадства праблемы, як дэфіцыт кахання, клопаты і спачуванні блізкіх людзей, сквапнасць і здрада. Пастаноўка прымусіла ўсіх задумацца: а што робіць чалавека шчаслівым? Дзеці і ўнукі ветэрана не асабліва ганарацца сваім дзедам і яго заслугамі, і гэта — трагедыя не толькі ветэранаў, а ўсяго народа. Сапраўды калі-небудзь франтавік застанецца ўсяго адзін. І што тады? Мы страцім сувязь з гісторыяй. З мінулым. Калі кожны задумаецца пра гэта хоць на секунду і дапаможа ветэранам, наша грамадства стане ў сотні разоў дабрэйшым і шчаслівейшым". Дзяўчына-школьніца ў гэтых радках сказала ўсё за нас усіх пра ветэранаў Другой сусветнай вайны і пра сучасную моладзь. І пра памяць.

Сцэна са спектакля "Белы ліст".

Драматург Васіль Ткачоў шчыра павіншаваў слонімскі калектыў з прэм'ерай і падзякаваў за тое, што сланімчане цікава і своечасова ажыццявілі гэту пастаноўку.

**— Васіль Юр'евіч, спектакль вельмі цёпла быў прыняты сланімчанамі. А як у вас нарадзілася ідэя напісаць такі твор?**

— Мяне не толькі вы пытаецеся пра гэта. Нават некаторыя калегі-пісьменнікі цікавіліся — як, маўляў, дадумаўся? Прыйшло ж, нахлынула — паспрабуй тут растлумачыць. Я і хацеў, калі працаваў над п'есай, адказаць на пытанне: што ж папрасіў апошні ўдзельнік вайны? Вось усе гэтыя адказы менавіта ў пастаноўцы слонімскіх артыстаў. Бо найперш яны пастараліся данесці мае думкі-развагі да людзей. Асабліва апошні ветэран вайны Іван Мітрафанавіч Асокін, ролю якога выдатна выканаў майстар сцэны тэатра Уладзімір Навумік. Ды і ўсе артысты са Слоніма пастараліся на славу. Спадзяюся, нам гэта ўсім разам і ўдалося ажыццявіць.

"Белы ліст" прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі, ён якраз закранае тыя струны чалавечай душы, якія хвалююць нас сёння, будуць хваляваць і заўтра. Ды кожны дзень! Гэта адносіны старэйшага і малодшага пакаленняў людзей, іншы раз няпростыя, складаныя стасункі паміж імі.

**— Я ўважліва і даўно сачу за вашай творчасцю. І ўсё ж, якім драматургам сябе лічыце - "вясковым" ці "гарадскім"?**

— Вядома ж, вясковым. А якім жа яшчэ! Сэрца, душа заўсёды там, дзе жывуць і мае героі-землякі. У вёсцы. У мяне ажно дзве вёскі, з якімі моцна знітаваны мой лёс. Вёска Гута на Рагачоўшчыне, дзе нарадзіўся, і вёска Іскань на Быхаўшчыне, дзе прайшло дзяцінства і маленства. І калі я пішу, дык абавязкова хаджу па родных мне сцежках. Толькі там — зямля маіх герояў! Каб не было яе ў мяне, магчыма б ніколі не напісаў камедыі "Без Ягора будзе гора", "Тату аж у Ляпёшкіне", "Жаночы вулей", "Слуп" і многія іншыя, якія ставяць сёння не толькі прафесійныя тэатры, але і многія народныя. У тым ліку і ў роднай Беларусі!

Дарэчы, на працягу ўсіх 30 гадоў сваёй творчай дзейнасці Слонімскі драматычны тэатр заўсёды надаваў важнае месца пастаноўкам ваенна-патрыятычнай тэмы. Гэта спектаклі "Трыбунал" па п'есе Андрэя Макаёнка, "Не пакідай мяне" па п'есе Аляксея Дударава і іншыя. Пацвярджэнне таму — і спектакль "Белы ліст", якім мы яшчэ раз аддаём даніну памяці і павагі ратнаму і грамадзянскаму подзвігу нашых дзядоў. Даўно сцёрты з твару зямлі месцы страшэнных крывапралітных баёў, але толькі не з памяці тых, хто коштам свайго жыцця здабываў і набліжаў Перамогу. Пакуль жыве памяць — будзем жыць і мы.

**Сяргей ЧЫГРЫН**
Фота аўтара

# Кветка ўнутры яе

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

**Як жыве цела? І як — дух? Ці залежаць яны адно ад аднога? Што такое мужнасць? Прыгажосць? Любоў? Добрае кіно запускае пералік вечных пытанняў, якія нараджаюцца адно за другім падчас і пасля прагляду карціны.**
**Менавіта такой, без сумневу, можна назваць стужку беларускага рэжысёра Андрэя Куцілы "Мне трэба поціскаў", што распачала сваю фестывальную гісторыю спецыяльнай адзнакай журы на Кракаўскім кінафестывалі. Гісторыя 92-гадовай Валяціны і яе паралізаванай дачкі — гэта невялічкі нарыс і вялікая драма, трагедыя і ўзвышаная паэма пра любоў двух родных людзей і іх жыццё дзесьці на ўскрайку беларускай вёскі.**

■■■

Па шчырасці, і не разабраць, хто ў карціне галоўны герой. Старая Валянціна, якая клапоціцца аб сваёй дачцэ, вядзе гаспадарку ў свой заможны век, ці 58-гадовая Таццяна, што ляжыць без руху ў ложку, мроячы пра свет і людзей.

Дакументальная стужка распачынаецца са знаёмства з маці. Валянціна разам з аднавяскоўцамі чакае аўталаўку. Трошкі размаўляе з жанчынамі. Потым купляе прадукты і, павольна цягнучы ровар, вядзе нас у свой дом. Лета. Дом Валянціны ў атачэнні познакаляровых флоксаў. Але гэты духмяны і зялёны свет яшчэ адна гераіня — яе дачка Таня — можа бачыць толькі ў акенца. Таццяна ляжыць на ложку, але мы дакладна не бачым яе твару, толькі часткі цела. Валянціна прапаноўвае ёй гарбаты з мятай — але жанчына адмаўляецца.

Ужо ў гэтым "уваходжанні" ў дом і свет сям'і можна бачыць вялікую далікатнасць рэжысёра (ён аператар і сцэнарыст), які не "эксплуатуе" хваробу гераіні, а дазваляе нам пазнаёміцца з Таццянай паступова: адкрыць жанчыну адначасова і як асобу, і як пакутніка.

■■■

Валянціна раскладвае перад намі сшыткі з вершамі дачкі і распавядае сваю і яе гісторыю. Таццяна хварэе ўжо даўно... Валянціне прапаноўвалі аддаць дачку — але яна не пагадзілася. "Маё дзіця, маё гора", — кажа яна. Браты Тані навучыліся чытаць і пісаць, а ў 16 гадоў дзяўчына прыйшла да Бога. Трымаючы ў зубах асадкі, алоўкі, пэндзлі яна пачала маляваць, пісаць вершы — на беларускай і рускай мовах. Мы па-сапраўднаму і знаёмімся з Таццянай менавіта так — праз яе аўтарскія вершаваныя радкі, дзённікавыя запісы, што агучвае актрыса Святлана Анікей.

Якая душа жыве ў тым скаваным целе? Ці можна ўявіць сабе адчай, які ахоплівае чалавека, што застаўся без руху? Ці можна памыліць пра тое, што дух чалавека немагчыма стрымаць? Вершы Тані неверагодна самотныя, пранізлівыя, але поўныя надзеі, веры, кротасці і любові. На малюнках — свет далёкі і блізкі: яе просты пакой, сустрэчы маладых закаханых на вуліцы, і хтосьці, хто прыйшоў наведаць дзяўчыну ў прыгожай сукенцы ў кветкі. Зграбная паненка ў доўгім строі задумліва глядзіць у акно — цікава, што гераіня малюнкаў Таццяны па вопратцы амаль з іншага веку.

Малюнкі Таццяны ў фільме "Мне трэба поціскаў" поўныя мараў, самоты і прагі жыцця.

Уяўны свет — і свет рэальны. Рэжысёр акуратна вяртае нас у апошні, калі маці зноў заходзіць у пакой, каб напаіць дачку ў спёкуходненькай вадзічкай, дакранушца да яе. "Мне трэба поціскаў", — так гучыць радок аднаго з вершаў гераіні.

■■■

Насамрэч, тыя поціскі патрэбныя і старой Валянціне. Жанчына засталася сам на сам са сваім горам, перажыўшы двух сваіх сыноў. Вось яна вяртаецца з поля і, спатыкнуўшыся, падае. Немагчыма не памыліць пра тое, а што ж будзе з Таццянай, калі з яе маці што-небудзь здарыцца? З кім яна застанецца?

Беларускае лета, поўнае зеляніны, сонца, дажджу і паветра. Блакітны дом у флоксах. "Клетка" цела Таццяны і прыгажосць яе душы, сіла духа. Любоў Валянціны, якую немагчыма вымераць. Колькі планаў, пауз, яскравых успышак малюнкаў Тані, фатаграфій — і ў невялікім нарысе адлюстроўваецца жыццё людзей і таямніца свету.

Як можна вымераць чалавечую любоў? Гадамі несупыннага клопату? Цярпенне ўласнай нямогласці? Хто з дзвюх жанчын мае большае сэрца? Спакойнае назіранне Андрэя Куцілы, у якім шмат павагі і думкі, эмпатыі, дзе ёсць месца недасказанасці і слову, складаецца ў кранальны партрэт сям'і, лакальны і ўніверсальны.

І ўсё ж мы такі ўбачым Таццяну напрыканцы фільма. Як Антуан Дуанэль у фільме "400 удараў" Франсуа Труфо яна паглядзіць на нас напроўсту у камеру. "Мора знутры" — так гучала назва аднаго з фільмаў Алехандро Аменабара. Пра Таццяну мне хочацца сказаць: кветка — унутры яе.

К

# Палымяныя аркушы

**Мне падаецца, што ў сценах выставачнага комплексу Нацыянальнай бібліятэкі найлепшым чынам глядзіцца менавіта графічнае мастацтва. Жывапіс, пластыка, узоры дызайну і ДПМ — някепска, а графіка дык проста выдатна. Можа таму, што выявы на паперы чымсьці роднасныя друкаваным тэкстам, для захавання якіх бібліятэка і створана.**

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

На гэтым тыдні чарговая выстава графікі адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы. І, як многія культурніцкія акцыі бягучага го-да, яна прысвечана юбілею Вялікай Перамогі і прымеркавана да Дня Незалежнасці — святаў, знітаваных самой гісторыяй. Назва "Полымя ваенных дзён" гаворыць сама за сябе.

Міхаіл Сеўрук. "Першы нямецкі танк, падбіты ў Нясвіжы".

Роза Дубар. "Дзяўчына ішла па вайне".

Творы на выставу прадастаўлены Беларускім саюзам мастакоў. Іх аўтары, кожны па свойму, спазналі на сваім лёсе гэта полымя. Гэта Яўген Зайцаў, Іван Ціханаў, Сяргей Каткоў, Віктар Сахненка, Віктар Ждан, Мікалай Абрыньба, Роза Дубар, Сяргей Раманаў, Міхаіл Сеўрук. Гэта збольшага замалёўкі з натуры, маляваныя дзённікі падзей, сведкамі якіх давялося быць згаданым аўтарам.

Што ж датычыць прадстаўленых тут жа аркушаў народнага мастака Беларусі Арлена Кашкурэвіча, дык значная частка іх мае літаратурную аснову. Зыходна гэта ілюстрацыі да кніг Васіля Быкава і Алеся Адамовіча. Потым яны развіліся ў самастойныя мастацкія творы, але ў іх захаваўся вобразны лад, драматызм і экспрэсія першакрыніц.

Шэраг прадстаўленых на выставе работ экспануецца ўпершыню.

К

Арлен Кашкурэвіч. "Выхад з Блакады".

# Талент як пазнака Бога

Яўген РАГІН

**Не прыйшлося доўга думаць над тэматыкай сённяшняга агляду. Яе падказалі метадысты Гродзенскага абласнога метадычнага Цэнтра народнай творчасці, якія абвесцілі набор канкурсантаў у новы інтэрнэт-праект. Ён называецца "#ТАЛЕНТЫДОМА". Так, пагаворым пра талент, як пазнаку Бога. Пагаворым пра тое, што талент варта вырошчваць як кветку: старанна і з поўнай адказнасцю. Але перад тым як вырошчваць, яго неабходна раскрыць. Бывае так, што сталы настаўнік і не падазрае, што мае абсалютны музычны слых і неблагі голас, а інжынер на пенсіі пачынае пісаць вельмі неблагія вершы. Таму вельмі важна знайсці сябе з дзяцінства, каб раз і назаўжды абраць адзіна правільны жыццёвы шлях. А бывае і так, што нечакана раскрыты талент становіцца дадатковым, так бы мовіць, сродкам самавыяўлення і дапамагае больш тонка зразумець і людзей, і навакольны свет.**

Дык вось, абвешчаны прыём заявак на ўдзел у адкрытым дыстанцыйным творчым конкурсе "#ТАЛЕНТЫДОМА". А запеўка ў метадыстаў **Гродзеншчыны** наступная: *"Лёгка бярэш самыя высокія ноты, але выступаеш толькі перад люстэркам? Віртуозна валдаеш скрыпкай, але здольнасці твае ацанілі толькі суседзі? Малодшы брат геніяльна чытае вершы, але ягоная адзіная сцэна — толькі кухонны табурэт? Любімая бабуля ўсё жыццё марыць трапіць "у тэлевізар", але слава зноў праходзіць міма? Надышоў час здзяйснення мараў!"* Вельмі, пагадзіцеся, пераканаўча. А конкурс такі ладзіцца ў Беларусі ўпершыню. Запрашаюцца абсалютна ўсе ахвотныя. Узрост, адукацыя, род заняткаў не маюць значэння. Галоўнае — выдумка і артыстызм. За Гран-пры і суперпрыз могуць пабароцца вакалісты, музыканты, акрабаты, комікі... Трэба толькі зняць выступленне на відэа. Прыём заявак заканчваецца 1 ліпеня. Вядучы метадыст па культурнадасугавай дзейнасці Ірына Міклашэвіч распавядае, што першыя заяўкі, што паступілі на электронны адрас, вельмі абнадзейваюць. Падсумоўванне вынікаў чакаецца 14 ліпеня. "К" абяцае адсочваць працэс вышукання талентаў.

**На здымках:**
**1 Знаная пявуння Марыя Шыдла з вёскі Погіры.**
**2 Узорны тэатр "Какос" на сцэне Палаца культуры горада Ліды.**
**3 Старажытнае рамёства саломапляцення шырока бытуе на Іўеўшчыне.**
**4 Масты: фальклорнае свята "Па сцежках спадчыны".**
**5 Работы мастака-разьбяра з Мазалава Аляксандра Захарчанкі.**

А цяпер пра таленты, якія даўно праславілі **Свіслацкі** раён. Гаворка — пра рамеснікаў, якіх тут больш за 60. Клубныя работнікі прыдумалі раённы інтэрнэт-праект "У госці да майстра". Давайце і мы наведаем спецыялістаў народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Да ўсіх патрапіць не паспеем, а вось з візітамі ў межах пушчанскага аграгарадка **Новы Двор** управімся з лёгкасцю. Мікалай Раманоўскі — разьбяр па дрэве з маладосці. Працуе у мясцовым лясніцтве. Прыгажосць драўніны рукамі адчувае. Падворак майстра — экспазіцыя ягоных вялізных і дробных работ... Іван Грушэўскі малюе па шкле, дрэве, палатне. Гэта партрэты, пейзажы, карціны гумарыстычнага зместу. У кожнага твора — свая гісторыя. Пра лёсы сваіх "дзяцей" мастак можа распавядаць бясконца... Валерыя Журкевіч вяжа кручком. Унутранае ўбранне яе дома — казачнае і вельмі цёплае, бо зроблена з вялікай душой.

*"7 чэрвеня ў сельскім клубе* **"Азёркі"** *прайшло фальклорнае свята "Па сцежках спадчыны",* — напісала Наталля Шэўчык з **Мастоўскага** раёна, — *Мерапрыемства ладзілася з захаваннем сацыяльнай дыстанцыі. Адзначалася свята Сёмухі. Галінкамі бярозы ўпрыгожваліся не толькі хаты і двары, але і сельскі клуб. Бярозе прысвячаліся песні і танцы".* Для таго, каб бярозавы брэнд доўга заставаўся на слыху, таксама немалы талент патрэбны.

Навіна з **Дзятлаўшчыны** — пра юбілей Марыі Шыдла з **Погіраў**. Яна не толькі цудоўная гаспадыня (дом — узорнага парадку), не толькі дбайная маці і бабуля. Марыя Мікалаеўна, якая нарадзілася за год да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, яшчэ і пявуння знаная, а муж — гарманіст Іван Шыдла. Разам у мясцовым клубе яны і ўтварылі песенны калектыў. 42 гады прайшло з тае пары. Але нязменнымі засталіся песні Марыі Шыдла. Доўга яны гучалі тым надвячоркам. Талент, калі за ім дбайна даглядаеш, з гадамі яшчэ больш пераканаўчым становіцца.

У мінулым нумары "К" я пісаў пра шматтраннасць талентаў Палаца культуры горада **Ліды**. Сёння варта дадаць да гэтага шматталосага хору і сола ўзорнага тэатра "Какос". 18 чэрвеня ён прэзентаваў пастаноўку "Няправільная казка пра Чырвоны Каптурок" паводле п'есы Аляксея Анісімава. Спектакль прайшоў у вялікай зале ўстановы, дзе сярод гледачоў былі захаваны нормы сацыяльнай дыстанцыі.

Шэраг лістоў прысвечаны Дню медыцынскага работніка. Клубнікі аграгарадка **Граўжышкі** (**Ашмянскі** раён) прысвяцілі медыкам відэа-канцэрт. Аналагічны канцэрт арганізавалі і ў **Ашмянах**.

Піша вядучы метадыст **Іўеўскага** Цэнтра культуры і вольнага часу Вольга Аўдзевіч: *"Арэол мастацкіх практык саломапляцення на* **Гродзеншчыне** *шырокі. З іх чатыры — на Іўеўшчыне: у раённым цэнтры, у аграгарадках* **Дайліды, Геранёны, Лепюкі**. *Гэтым практыкам нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. У гэтую суботу на тэлеканале "Беларусь 3" выйшла праграма, прысвечаная талентам нашых саломапляцельшчыкаў".*

Пра чарговы талент паведамляе Андрэй Струнчанка. Ён вядзе гаворку пра мастака-разьбяра з **Мазалава** (**Віцебскі** раён) Аляксандра Захарчанку. У мясцовым клубе працуе выстава работ Захарчанкі, якая называецца "Магія дрэва і фарбаў".

Вы чулі гэты выраз: "Таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім". Жыццё пастаянна пацвярджае гэтую выснову. Чарговы доказ — дзейнасць Валянціны Лабуніной. Загадчык сельскай бібліятэкі аграгарадка **Гальшаны** з **Ашмянскага** раёна Таццяна Іванова распавядае: *"У нашай установе дзейнічае фотавыстава "Гэты дзень мы набліжалі як маглі..." Аўтар здымкаў — Валянціна Лабуніна, былы загадчык Гальшанскай дзіцячай бібліятэкі. Валянціна Сцяпанаўна — яшчэ і краязнаўца. Свае першыя здымкі зрабіла ў 1967 годзе пад час мітынгу ў памяць загінулых у Вялікую Айчынную вайну землякоў. Шэраг фота зроблена на дарозе Валожын — Гальшаны, тут 25 чэрвеня 1941 года лётчыкі Аўдзееў і Стралёнак накіравалі свой палаючы самалёт на фашысцкую калону. І такіх здымкаў на выставе — вельмі шмат. Ветэранаў у нас ужо не захавалася. А Памяць жыве."*

Можна не маляваць, не спяваць, не танцаваць і не паказваць акцёрскую нязмушанасць на аматарскай тэатральнай сцэне, але заставацца талентам у сваёй адзінай прафесійнай справе. Пра гэта распавядаюць калегі бібліятэкара бібліёбуса **Шчучынскай** раённай бібліятэкі імя Цёткі Ірыны Яцкевіч: *"Яна здолела правесці для жыхароў вёсак* **Старыя Паддубы, Шастакоўцы** *і* **Пераходы** *інфармацыйны дайджэст "Бібліятэка і кнігі — лекі для душы". Ірына пазнаёміла вяскоўцаў з выданнямі тых жанраў, што спрыяюць адпачынку. Гаворка ішла пра дэтэктывы, меладрамы, сямейныя эпапеі. Чытачы разабралі ўсе прапанаваныя кнігі".* Цікава было б даведацца, а якія канкрэтна кнігі разабралі. Урэшце, "Ганна Карэніна" — таксама меладрама, а "Злачынства і пакаранне" — дэтэктыў.

Яшчэ адна інфармацыя са **Свіслацкага** раёна. Кіраўнік раённай бібліятэкі Святлана Піваварчык паведамляе, што ў яе супрацоўнікаў склаліся добрыя стасункі з паэтамі-землякамі. Да слова, бібліятэка поруч з выкананнем непасрэдных абавязкаў займаецца яшчэ і выпускам вершаваных зборнікаў з серыі "Свіслаччына літаратурная". *"У чэрвені,* — піша аўтар, — *з нагоды 75-годдзя мясцовага паэта Івана Ламашкевіча пабачыў свет зборнік "Адгалосак мінулага лета". Іван Канстанцінавіч нарадзіўся ў год Вялікай Перамогі. Піша на рускай і беларускай мовах. Вершы прасякнуты любоўю да роднага краю, раскрываюць прыгажосць краявідаў, дакладна адлюстроўваюць чалавечыя пачуцці, вучаць дабрыні. Дарэчы, адзін з вершаў прысвечаны нашай бібліятэцы".* Цалкам верагодна, што хтосьці з юных чытачоў, пачуўшы вершаваныя радкі Івана Ламашкевіча, і сам паспрабуе ствараць вершы, рыфмаваць сваю душу з сэрцам.

Можна быць таленавітым у любові? Толькі так, падаецца, і можна. У адваротным выпадку пра якую любоў гаворка. Але таленту — мала. Любоў — гэта яшчэ і вялікая праца па ўласным ўдасканаленні. Менавіта так у Бацькаўшчыны нараджаюцца верныя сыны. Пра гэта цудоўна ведаюць метадысты **Ашмянскага** раённага Цэнтра культуры. Яны падказваюць чытачам "К", што загадчык сельскага клуба аграгарадка **Баруны** Алена Альшук прапануе знаёмства з мясцовым краем, асноўнымі турыстычнымі аб'ектамі, знакамітымі асобамі. Адпаведнае відэа ў інтэрнэце называецца "Анлайн-трэвэл-праект. "Слынная Барунская зямля" (сельскі клуб аграгарадка Баруны).

Не спыняйцеся працаваць над сабой!

Сустрэнемся праз тыдзень.

К

# Зямля, дзе нарадзіўся Быкаў

**Славутую на “вікторыі” і адначасова горкую на страты падчас Вялікай Айчыннай вайны гісторыю Ушацкага раёна, думаю, ведае — хто ў большай ступені, хто ў меншай — кожны жыхар нашай краіны, пачынаючы ад школьнікаў сярэдніх класаў. І 75-годдзе з Дня Перамогі над нацысцкім бязлітасным ворагам адзначалі там з асаблівымі ўрачыстасцю і смуткам. У мерапрыемствах, прысвечаных гэтай слаўнай даце, удзельнічалі і работнікі мясцовых установаў культуры, многія з якіх уваходзяць у структуру галаўную.**

Алег КЛІМАЎ

Лаўрэаты конкурсу “Песні юнацтва нашых бацькоў”.

Акцыя аўтаклуба “Дарогамі памяці”.

## ТРЫА

— А вы ведаеце, што з сямнаццаці народных пісьменнікаў і паэтаў Беларусі трое родам з нашых земляў? — апярэдзіла мяне сваім пытаннем дырэктар Ушацкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці Валянціна Літвін.

**— Васіль Быкаў...**

— ...Пятрусь Броўка і Рыгор Барадулін! Да 85-годдзя з дня нараджэння Рыгора Іванавіча ў лютым мы арганізавалі ў сябе літаратурнае свята “Трэба дома бываць часцей” і музычны вечар “Я — сын гэтай зямлі”. Такія назвы былі абраныя нездарма, бо творчасць паэта цесна пераплецена з Ушаччынай, з яе традыцыямі. Яго вершы — невычэрпны літаратурны скарб, да якога можна звяртацца зноў і зноў, што і робяць на сваіх мерапрыемствах прыхільнікі спадчыны Барадуліна з народнага клуба творчых сустрэч “Муза”, які дзейнічае пры Цэнтры.

У сакавіку аб’яднанне паспела ажыццявіць яшчэ дзве “жывыя” імпрэзы. Многія яго ўдзельнікі не проста “песцяцца” складаннем вершаў, а ўжо выдаваліся ў зборніках і нават маюць уласныя кнігі — гэтым талентам і было прысвечана пасяджэнне “Паэзія маёй Ушаччыны”. У гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі рыхтуецца і альманах майстроў рыфмы Ушацкага раёна: пад адной вокладкай збяруць творы на ваенную тэматыку дваццаці з лішнім аўтараў. А літаратурна-музычную гасцёўню “Мастацкія вобразы Віцебшчыны ў паэзіі Еўдакіі Лось” прысвяцілі творчасці знакамітай зямлячкі. Дарэчы кажучы, 90-годдзе з дня нараджэння Еўдакіі Якаўлеўны ў 2019-м адзначылі ў гарадскім пасёлку Ушачы і святам “Калі радок дыктуе пачуццё...”, і адкрыццём памятнага інфармацыйнага стэнда з яе партрэтам, біяграфічнымі звесткамі і вершамі. І, нягледзячы на каранавірус, на радзіме Васіля Быкава ў вёсцы Бычкі РЦКіНТ правёў традыцыйнае свята і плануе паэтычнае падарожжа ў вёску Пуцілкавічы, дзе 25 чэрвеня 1905 года нарадзіўся Пятрусь Броўка.

— Пандэмія, вядома, унесла карэктывы ў нашы задумкі, аднак мы не маем намеру адмаўляцца ад тых культурных брэндаў, якія ў мінулым годзе распрацаваў метадычны аддзел Цэнтра, — кажа Валянціна Уладзіміраўна. — Тады ўпершыню прайшлі раённыя святы малака ў аграгарадку Вялікія Дольцы, возера ў Вяркудах, беларускай хаты ў Глыбачцы, бульбы ў Кублічах, бліноў у Арэхаўна, а ў вёсцы Матырына — ручніка. Разлічваем, такія імпрэзы і надалей будуць спрыяць павышэнню турыстычнай прывабнасці рэгіянальных мерапрыемстваў, нараджэнню іх новых форм, далейшаму развіццю мастацкай самадзейнасці на сяле і фарміраванню культуры зносін на аснове спасціжэння традыцый і звычаяў краю. Таму чакаем, калі “болька” адступіць, і пералічаныя мной вышэй святы абавязкова правядзём на вялікую аўдыторыю, ва ўсялякім выпадку тыя, што намечаны на восень.

Сярод іншых планаў, якімі са мной падзялілася спадарыня Літвін, ёсць як “жывыя”, так ужо і дыстанцыйныя раённыя конкурсы: вакальных калектываў “Спявай, душа!”, тэатральных і фальклорных “Рознакаляровая восень”, культарганізатараў “Вясёлкавы карагод”, анлайн-фотаконкурс “Мы шчаслівыя, таму што разам”...

Ну а ніжэй я прапаную вам інфармацыю, звязаную з лічбамі, зрэшты, і не толькі з імі.

Валянціна Літвін.

Узорны фальклорны калектыў “Спадчына”.

Народны калектыў “Ветэран”.

## СТАТЫСТЫКА ВЕДАЕ ЎСЁ

Напрыклад, тое, што на Ушаччыне разам з РЦКіНТ дзейнічаюць яшчэ 13 клубных установаў: 11 — на вёсцы, ушацкія Дом рамёстваў і Аўтаклуб. На канец 2019-га года там працавала 92 фарміраванні з агульнай колькасцю 863 чалавекі, з іх 46 — дзіцячых (323 удзельнікі). Шэсць калектываў, якія ўваходзяць у структуру Цэнтра, носяць званне “народны”: акрамя “Музы”, гэта народныя клубы нацыянальнай кухні “Прысмакі”, ветэранаў працы “Ветэран” і майстроў народных мастацкіх рамёстваў “Адраджэнне”. А таксама народны клуб нацыянальных культур “Дружба”, ён прыпісаны да Аўтаклуба, і народны фальклорны калектыў “Матырынская спадчына” з Матырына. Дзіцячы фальклорны калектыў “Спадчына” з таго ж населенага пункта мае званне “ўзорны”: яго выхаванцы ў лютым на XIII абласным аглядзе-конкурсе фальклорнай творчасці дзяцей і моладзі “Ад прашчураў да зор” у Расонах узялі дыпломы Першай і Трэцяй ступеняў. А наогул, да перадавых сельскіх самадзейных артыстаў Валянціна Літвін адносіць тыя, што выступаюць у Арэхаўскім, Вяркудскім, Вялікадолецкім і Глыбачанскім дамах культуры.

За першы квартал года клубнымі ўстановамі раёна падрыхтавана і праведзена 763 мерапрыемствы (паводле Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2016 — 2020-я гады ў гэтым РЦКіНТ і яго падраздзяленнях іх павінна быць 2500). На платнай аснове — 336, іх наведаў 4601 чалавек (а ўсе імпрэзы — 19992). З асноўных формаў адбыліся 123 канцэрты і спектаклі; 41 свята, абрад і тэатралізаванае прадстаўленне; 30 выстаў. “І дванаццаць конкурсаў, — дадае дырэктар. - Паспелі да віруса з такімі буйнымі імпрэзамі, як раённыя конкурсы маладых выканаўцаў патрыятычнай песні “Песні юнацтва нашых бацькоў”, харэаграфічных калектываў “Танцавальная вясна” і на лепшую літаратурна-музычную кампазіцыю “Мы памятаем!”

## АСОБНА — АБ АЎТАКЛУБЕ

На маю просьбу спыніцца крыху больш падрабязна на дзейнасці якой-небудзь адной установы, што знаходзіцца ў структуры Цэнтра, Валянціна Уладзіміраўна абрала Аўтаклуб:

— Дзякуючы сваёй мабільнасці, ён з’яўляецца сувязным звяном паміж аддаленымі вёскамі і намі, дорыць мясцовым жыхарам незабыўныя сустрэчы, прыемны адпачынак, добры настрой.

За ўсё той жа першы квартал Аўтаклубам падрыхтавана 43 мерапрыемствы для сельскага насельніцтва: у іх былі занятыя артысты з дзіцячай вакальнай студыі “Забавушка”, ансамбля народнай песні “Раздолье”, вакальнага калектыву “Ушачаначка” і ўжо згаданага мной клуба “Дружба”. Адным з асноўных напрамкаў у дзейнасці ўстановы з’яўляецца патрыятычнае выхаванне моладзі і прапаганда гісторыі роднага краю і вайсковай славы Ушаччыны. Да прыкладу, з 26 мая па 2 чэрвеня яго супрацоўнікі прымалі ўдзел у абласной патрыятычнай акцыі “Дарогамі памяці”. У яе рамках у раёне былі праведзены добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў, абеліскаў, устаноўленых у гонар землякоў, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне, мітынгі і цырымоніі ўскладання кветак да мемарыялаў. Работнікі Аўтаклуба выявілі і невядомае раней вайсковае пахаванне Антона Прахаровіча — партызана брыгады імя Васіля Чапаева.

## “КАДРЫ ВЫРАСЦІМ САМІ”

— Што турбуе мяне ў працы нашых падраздзяленняў? — задумваецца спадарыня Літвін. — Негатыўны ўплыў на дзейнасць сельскіх установаў культуры аказвае дэмаграфічная сітуацыя. Але гэта характэрна для многіх рэгіёнаў, — калі ў вёсках зачыняюцца школы, і ў лепшым выпадку іх навучэнцы ездзяць на ўрокі на аўтобусе ў школы суседніх населеных пунктаў. Натуральна, па вяртанні дзеці ў першую чаргу сканцэнтраваны на выкананні хатніх заданняў. А потым у гурткі ім ужо ісці і няма калі, і не хочацца. Адпаведна, пакутуе наведвальнасць фарміраванняў. Ці такая праблема — недахоп спецыялістаў, якія маглі б іх узначаліць. Займець выпускнікоў профільных ССНУ і ВНУ — задача нялёгкая. Даводзіцца арыентавацца на тое, што побач — на мясцовых жыхароў, на тых, у кім бачым задаткі арганізатараў, хто гарыць жаданнем паспрабаваць рэалізаваць сябе ў сферы культуры. Канешне, адпраўляем іх на курсы павышэння кваліфікацыі — зараз, між іншым, яны праходзяць у анлайн-рэжыме. І ў сельскіх клубаў і палацах культуры, і нават у Цэнтры не ўсё добра з матэрыяльна-тэхнічнай базай. Хацелася б абнавіць рэквізіт, касцюмы, гукавую і светлавую апаратуру. А вось стан будынкаў хваляванняў не выклікае: вялікая іх частка — наогул новыя, а старыя абавязкова штогод падлатваюць.

■■■

Валянціна Уладзіміраўна — як шматгадовы прафесіянал сваёй справы, чалавек суперадказны і прамы, цяжкасцяў не хавае. Яны прыходзяць і сыходзяць. Галоўнае, каб сам культурны працэс на Ушаччыне быў бесперабойным. Цікавым, наватарскім. А з ідэямі ў раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці і яго падраздзяленнях усё ў парадку.

К

Фота аўтара і з архіва Ушацкага РЦКіНТ

**Менавіта так: прачніся — і спявай! Бо ад песні душа маладзее. Асабліва ад народнай. Гэта аксіёма. І сумнявацца не даводзіцца, калі глядзіш на Марыю Будзько. Наша размова пачалася… з націску кнопкі на пульце для тэлевізара. Марыя Станіславаўна ўключыла запіс святкавання свайго 80-годдзя. Без перабольшання, гэта быў бенефіс нашай гераіні. У старэнькім Валэйкавіцкім клубе, у якім яна адпрацавала-адспявала 60 гадоў, сабраліся родныя, сябры, аднавяскоўцы — цяперашнія і былыя.**

Бабуля Ганя і яе скарбы.

# Песні бабулі Гані

## КАЛІ Б НЕ КАСМАНАЎТ

Пасля школы Марыя паступіла ў Гродзенскае культасветвучылішча, скончыла яго і пачала працаваць у Валэйкавіцкім клубе. Потым вучылася ў Гродзенскім педінстытуце імя Янкі Купалы. Да клубнай работы дадалася яшчэ і настаўніцкая. Атрымала дыплом выкладчыка гісторыі — і адразу маладую жанчыну прызначылі дырэктарам мясцовай базавай школы, якую на той час наведвала больш за сто вучняў. Амаль усе яны спявалі ў хоры. Сама дырэктар — у калгасным хоры. У клубе тады існаваў ансамбль "Крыніча-нька". Разам з хорам ён стаў падмуркам, на якім у 1976 годзе стварылі народны фальклорны калектыў "Валэйчанка".

— Мая мама Ганна Стурліс была ля вытокаў "Валэйчанкі", — удакладняе Марыя Станіславаўна. — Была кампазітарам, рэжысёрам, сцэнарыстам, магла правесці майстар-клас у сельскім клубе на высокім узроўні.

А ў 1986 годзе ў Валэйкавічах з'явіўся дзіцячы фальклорны калектыў "Кропелькі", які пазней стаў узорным. Напэўна, мала хто ведае, што імпульсам для стварэння "Кропелек" стала зацікаўленасць касманаўта Віталя Севасцьянава. У сярэдзіне 80-х гадоў мінулага стагоддзя Віталь Іванавіч разам са знакамітай вядучай і актрысай Таццянай Ведзянеевай наведалі Смаргоншчыну. У Снігянах на месце іх віталі самадзейныя артысты. Вядомы касманаўт пахваліў "Валэйчанку", падзякаваў за выступленне і нечакана для артыстак пацікавіўся, ці ёсць каму перадаць багатую народную спадчыну, ці гадуюць яны сабе змену.

"Вось тады мы задумаліся... Сапраўды, хто праз дзясяткі гадоў будзе спяваць нашы песні? — кажа Марыя Будзько. — Неўзабаве сабралі самых таленавітых і галасістых ўдзельнікаў школьнага хору і стварылі новы дзіцячы калектыў, хормайстрам якога стала мая калега Ванда Роля".

Марыя Будзько ў маладосці.

"Валэйчанка" выступае ў мясцовым Доме культуры...

Кнігі-дапаможнікі.

## ДЫРЭКТАР НА СКУТАРЫ

Пра "Валэйчанку" можна прачытаць у дзвюх энцыклапедыях Беларусі. Вясковыя артысткі тройчы пабывалі ў Літве, двойчы — у Польшчы, шмат дзе ў Расіі і практычна ва ўсіх кутках Беларусі. Перамогі ў разнастайных конкурсах народнай фальклорнай музыкі — ад рэгіянальных да міжнародных. Дыпломы, падзякі, апладысменты... Дарэчы, гэты сезон фальклорнага тэлепраекта "Спявае Беларусь" адкрываўся перадачай менавіта пра "Валэйчанку".

Працаваць дырэктарам, выкладаць гісторыю, гадаваць сваіх дваіх дзетак і займацца самадзейнасцю — і ўсюды трымаць высокую планку. Такое ўвогуле рэальна? Так. Той, хто жыве творчасцю, валодае неймавернымі здольнасцямі. Той, хто шчыра дорыць радасць, узамен атрымлівае яе нашмат больш. Радасць перапрацоўваецца ў энергію, якая сілкуе душу і цела.

Як і раней, Марыя Будзько двойчы на тыдзень спяшаецца са сваіх Рачунаў у Валэйкавічы на рэпетыцыю. На чым толькі не даводзіцца дабірацца туды хормайстру. На лесавозе, на школьным аўтобусе, а яшчэ нядаўна ездзіла на сваім скутары. Думка, каб прагуляць рэпетыцыю, нават у галаву ёй ніколі не прыходзіла. Там жа яе чакаюць "дзевачкі".

## ШТО Ў КУФЭРКУ БАБУЛІ ГАНІ?

Марыя Станіславаўна — сапраўдны клад для аматараў даўніны. Яе творчы багаж - у тоўстых сшытках, у брашурах, у касетах (па падліках жанчыны, іх 60), дысках і флэшцы.

Ад маці Ганны яна запісала дзве сотні песень, падзяліла іх на шэсць раздзелаў і стварыла спеўнік пад назвай "Куфэрак бабулі Гані". У ім — большасць песень на беларускай мове, але ёсць і на рускай, і на польскай. Захаваліся ў маёй субяседніцы і аўдыёзапісы, дзе гучыць голас яе мамы.

— Мая мама добра ведала і любіла песні сваіх продкаў, сваёй мясцовасці, мела добры слых і голас, была запявалай сярод вяскоўцаў, — кажа Марыя Станіславаўна. — Хочаце верце, хочаце не, але на адкрыцці II Еўрапейскіх гульняў спартсмены ішлі пад "песні бабулі Гані". На свае вушы чула, калі глядзела шоу па тэлевізары.

Да таго ж жанчына сама напісала 25 песень. У кожнай — жыццё народа. Наша. Мясцовае. Яны ўслаўляюць прыгажосць малой радзімы, асабліва тых мясцін, дзе нарадзілася аўтарка, — хутар Лісова. "Вечарынка на Лісове", "Лісоўская рыбачка", "Лісоўская забава-полечка"... А калі тапонім не згадваецца ў назве, у тэксце абавязкова заўважыш маляўнічыя пейзажы, адметныя дэталі, музычныя асаблівасці куточка, дарагога сэрцу.

Тут прайшлі юныя гады Марыйкі. Сям'я жыла дружна, заможна, аднак заможнасць гэтая дорага каштавала: працаваць даводзілася шмат. Але і адпачываць тут умелі. Музыка суправаджала і працу, і адпачынак.

... і на рэспубліканскім фестывалі "Смаргонскія абаранкі".

## "Я СПЕЎНІК МАЮ!"

— Не ведаю, куды дзецца з гэтай багатухнай! — смяецца жанчына. — Наш калектыў спявае 12 песень (трынаццатую — развучваем), дзве — у рэпертуары "Кропелек". А яшчэ адзінаццаць пакуль у спеўніку. Чакаюць свайго "зорнага" часу.

— І словы, і музыка вашы?

— Усё маё! З аддзела культуры прыязджалі, запісалі на дыктафон, слухалі, як выконваю свае песні. А настаўнік школы мастацтваў Чэслаў Жых распісаў ноты песень. Цяпер маю надрукаваны спеўнік сваіх твораў з нотамі *(паказвае)*.

Я чытаю ўступ да спеўніка: "Уявіце сабе малюнак: сенажаць з рознакаляровымі духмянымі кветкамі, у якую палоскай уплятаецца жыта, каласуе, пераліваецца хвалямі, нібы мора, гучыць спеў жаўранка, сонейка ззяе... Гэтыя незабыўныя малюнкі я бачу і сёння. З вялікай удзячнасцю і гонарам за свой родны куток напаўняю імі сваю творчасць".

— "Палоска сцелецца між жыта, а ў небе жаўрукі пяюць...", — цытую кампазіцыю "Давайце сабярэмся разам", якую выконвае беларуская спявачка Жанэт. Гэта ж ваша песня?

— Так! А другую песню — "Вясковая забава" — спявае Валянціна Альшанская. Маю аўтарскія правы на гэтыя творы, нават штомесяц атрымліваю грошы (хоць і невялікія) за іх выкананне.

Паказала Марыя Станіславаўна яшчэ адзін рукапіс "Адраджэнне культуры беларускага сялянства ў творчасці Валэйкавіцкага сельскага клубы. Карані і вытокі душы народнай". І ўдакладніла: "Гэта ўжо ўся гісторыя маёй старонкі. Так хацелася б кнігу выдаць".

— Вы тут нарадзіліся, вучыліся, сюды прыехалі па размеркаванні пасля культасветвучылішча. А ці хацелі калі з'ехаць у іншае месца? — цікаўлюся, але адчуваю, што адказ будзе прадказальны.

— Ніколі! Муж прапаноўваў у горад пераехаць. А я — не! Я не прыжылася б у горадзе. Без зямлі, без гэтай прыроды, паветра, песень. Тры гады таму мне зрабілі вельмі складаную аперацыю. Лічы, новае сэрца ўставілі... Вы думаеце, я б пасля аперацыі выжыла ў іншым месцы? Я сілы свае ўзнаўляла на гэтай зямлі. З гачкай у руках. Тут маё жыццё. Мая энергетыка. Мая душа.

**Галіна АНТОНАВА**
**Смаргонь**
Фота аўтара

# Сусветныя лэйблы і мінскі тэхна-блюз

*Неверагодная гісторыя Intelligency*

**Удача ці талент — у чым сакрэт поспеху ў свеце сучаснай папулярнай музыкі? Бадай, павінны злучыцца і адно і другое. Мінская група Intelligency сем гадоў працавала, выпускала альбомы, радавала прыхільнікаў канцэртамі, расла і сталела. І вось прыйшоў момант, калі Фартуна пабачыла, што калектыў нарэшце заслужыў яе ўвагу: новая песенька August, што ўзарвала інтэрнэт і розныя рэйтынгі па ўсім свеце, Фартуне спадабалася. Як мінскай групе заключыць кантракт з грандам сусветнага шоу-бізнесу, нам раскажуць музыканты групы Intelligency Усевалад ДОУБНЯ і Юрый ТАРАСЕВІЧ. Раскажуць яны і пра тое, як важна, нягледзячы ні на што, верыць у сябе.**

Надзея КУДРЭЙКА

**— Калісьці свой праект вы пачыналі без асаблівых амбіцый. Тое, што сёлета адбылося, стала для вас сюрпрызам?**

**Усевалад**: Мы не толькі пачыналі без амбіцый, мы былі ўпэўнены, што ў тым жанры, які абралі — тэхна-блюз, як мы гэта называем, сумяшчэнне электронікі і лайва — у прынцыпе немагчымы нейкія прарывы, што гэта само па сабе для невялікага кола аматараў. Intelligency ўтварылі мы з Юрам: я на той час ладзіў ды-джэйскія вечарынкі, ён як ды-джэй на іх выступаў. І сапраўды — пару гадоў мы пісалі ў стол. Потым склад пашырыўся, з'явілася пэўнае кола прыхільнікаў. У снежні мінулага года выйшаў наш новы альбом Renovatio, ужо ў самой назве якога было закладзена тое, што мы змяніліся і пачынаем нейкі новы этап: нарэшце мы выкрышталізавалі менавіта тое гучанне, якога хацелі дасягнуць.

Песню August мы апублікавалі летам яшчэ год назад: яна была такая ж, як і ўсе нашы творы, проста больш лёгкая па настроі, і ў ёй была фішачка, ці — дроп, як кажуць у сучасным музычным свеце, запамінальная музычная частка. Паступова August разыходзіўся ў інтэрнэце, і ўжо зімой пад час невялічкага канцэртнага тура — Мінск, Масква, Кіеў — мы пачалі заўважаць, што нешта адбываецца: напрыклад, аншлагі і перааншлагі на канцэртах.

**Юрый**: На той момант мы ўжо ўпэўніліся ў тым, што правільна абралі новы накірунак, і што August — трэк, які працуе сам па сабе. І вырашылі здымаць на яго кліп, хаця грошай асабліва і не было. Карацей, ішла звычайная праца. І тут...

**— Вы ж самі са сваім трэкам нічога не рабілі — уся гэтая хваля пачалася і развівалася без вашага ўдзелу?**

**Усевалад**: Мы і не ведалі нічога, пакуль недзе ў лютым не сталі заўважаць, што Вконтакце ў нашай старонкі імкліва расце статыстыка ўнікальных наведнікаў. Пачалі разбірацца чаму, і натрапілі на ролік, які на Youtube меў ужо неверагодную колькасць праглядаў: адзін расійскі юзэр узяў са славутага амерыканскага тэлешоу Джымі Фэлана кадры, як вядучы танцуе разам з госцем, кінаакцёрам Бенэдзікам Камбербэтчам, і зрабіў ролік, дзе ў якасці музычнага суправаджэння іх танца выкарыстаў урыўкі з 10 папулярных песень. Адной з іх і быў наш August, менавіта той самы запамінальны дроп, які ідэальна супаў з танцам Камбербэтча. І вось такая сіла інтэрнэту, што пайшла хваля. У коментах усе пыталіся — а што за трэк іграў чацвёртым? Ніхто ж не ведаў. А калі August дайшоў і да новай сацсеткі TikTok, якая за апошні год заваявала ўвесь свет, то стрэліў там з неверагоднай сілай — за кароткі тэрмін карыстальнікі стварылі недзе 150 тысяч кароткіх роліка ў з нашай музычкай, з гэтым урыўкам песні. Але ізноў жа ніхто не ведаў назвы, таму наступным "падарваўся" Shazam (сэрвіс пошуку песень): песня імгненна скочыла ў лідары сусветнага хіт-парада Shazam — 21-е, 25-е месца, доўга была ў Топ-30.

**— Я зазірнула на Youtube, каб паглядзець свежую статыстыку: кліп August на рускай мове — 10 мільёнаў праглядаў, песня без відэа — 7 мільёнаў, відэа на англійскай мове — 2 мільёны, і гэта ж толькі вашы афіцыйныя ролікі. Для беларускіх нераскручаных музыкантаў — проста фантастыка.**

**Юрый**: Насамрэч, гэта такое неверагоднае супадзенне фактаў, такі ланцуг выпадковасцяў, які і прывёў да падобнай шалёнай папулярнасці. Напрыклад, калі б той чалавек, які запусціў наш трэк у TikTok, падпісаў яго нармальна, то нікому не прыйшлося б яго шукаць, і ён не узляцеў бы ў Топ-30 Shazam, і гэтак далей. Але ўсё ж я хачу пазначыць, што калі б песня сама па сабе не была такой яскравай і запамінальнай, то нічога б і не атрымалася.

**Усевалад**: Сапраўды, у многіх ёсць ілюзія, што TikTok можна выкарыстаць для раскруткі песні — абсалютна не так. Там павінна супасць нешта такое няўлоўнае, чаго не пралічыць, бо гэта вельмі хаацічная, асістэмная сетка. І прадказаць, які трэк карыстальнікі настолькі палюбяць, што павальна будуць выкарыстоўваць для сваіх роліка ў, немагчыма.

**— Я так разумею, што на лэйблах спецыяльныя людзі адсочваюць і Shazam, і іншыя рэйтынгі, і знаходзяць патрэбнае для сябе, так знайшлі і вас. Уяўляю, наколькі вы былі агаломшаны — малавядомы калектыў з Мінска, і тут усе монстры сусветнага шоу-бізнесу спрабуюць вас заманіць да сябе!**

**Усевалад**: І не кажыце! Мы па вечарах збіраліся камандай, каб абмяркоўваць прапановы (а ў нас яшчэ басіст Міхаіл Станевіч і гітарыст Яўген Мурашка), і пыталіся адзін у аднаго — што адбываецца, што за трэш? (смех) Калі б мне нават за месяц да тых падзей хто сказаў, што так будзе, я б любыя грошы паставіў на тое, што падобнае немагчыма, што гэта неверагодная гісторыя. Усё ж развівалася цягам літаральна некалькіх тыдняў і ў нас не было часу нават апрытомнець. Першым на нас выйшаў вялікі расійскі лэйбл, потым другі, трэці, потым пайшлі прапановы з іншых краін. І нарэшце дайшла чарга да самых уплывовых і буйных лэйбаў свету: уся галоўная троіца — Sony, Universal і Warner — хацела купіць нашу музыку. І мы ўжо пагадзіліся прыняць вельмі прыстойную прапанову ад Sony music, як са мной на сувязь выйшаў славуты Грэг Нэйдл з Нью-Йорка — а ён вёў шэраг сусветных зорак, у тым ліку Эда Шырана і Coldplay — і зрабіў нам прапанову ад імя Warner music. Кажа — колькі ў мяне ёсць часу, каб заключыць з вамі кантракт? Я адказваю, што заўтра да нас з дакументамі на подпіс прылятае чалавек ад Sony. — Okay. — І ранкам гендырэктар расійскага аддзялення Warner нам патэлефанаваў і назваў такую лічбу, што мы не маглі ўжо адмовіцца.

**Юрый**: Хаця тут ужо і Universal заявіў пра свой інтарэс да нас, і ў іншых іграко ў пачалі расці стаўкі. Але мы вырашылі больш не цягнуць і падпісалі кантракт. З Warner зараз працуюць Эд Шыран, Дуа Ліпа, Twenty One Pilots і многія іншыя суперзоркі, з расійскіх Ягор Крыд і Little Big, напрыклад. Усё шыкоўна. Канешне, нам было крыху няёмка ў апошні момант адмаўляць Sony, але, думаю, у бізнесе гэта звычайная справа і яны прывыклі.

**— Увогуле, вы цалкам задаволеныя і сумай, і ўмовамі? Цяпер жа не так, што калі музыкант падпісвае кантракт з лэйблам, то быццам трапляе ў рабства?**

**Усевалад**: Задаволены абсалютна. І ніякага рабства — працуюць ужо зусім іншыя схемы. Яны купілі нашу музыку — альбом Renonatio — лічбы — ты цікавы лэйблам. У прынцыпе, калі маеш добрую музыку, ты і сам на ёй можаш добра зарабляць праз Youtube і іншыя лічбавыя пляцоўкі.

**— А многія ж нашы беларускія артысты з галіны так званай эстрады скардзяцца, што з-за пандэміі ў іх няма канцэртаў і карпаратываў, таму ім і зарабляць няма чым..**

**Усевалад**: Не верце! Я ведаю многіх і не надта папулярных беларускіх музыкантаў, якія ўвогуле не выступаюць, а толькі інтэрнэтам зарабляюць столькі, колькі і IT-шнікі. Свет змяніўся, і даходы ад лічбавых продажаў цяпер супастаўныя з паловай даходаў ад насычанай канцэртнай дзейнасці. Канешне, калі ў цябе такая музыка, што не выклікае ніякай цікавасці ў карысталь-

Фота прадастаўлена групай

> *Зараз усё вельмі прагматычна, шоу-бізнес зводзіцца да простай лічбы. Ніхто не будзе разбірацца, наколькі ты перспектыўны, таленавіты, — пакажы лічбы праслухоўванняў і праглядаў! Ёсць лічбы — ты цікавы лэйблам.*

кабзарабляць на ёй у інтэрнэце, у рэкламе, у кіно... Яны дапамагаюць нам з дыстрыб'юцыяй, прамоцыяй, кансультацыямі спецыялістаў. Наш August цяпер гучыць на радыёстанцыях усяго свету, вельмі папулярны ў Польшчы, у краінах Балтыі. Нават у Мексіцы і Паўднёвай Амерыцы! І наколькі мы чулі, лэйбл за гэтыя пару месяцаў ужо адбіў заплачаную за альбом суму, якая нам здавалася такой вялізнай. І нашу новую музыку Warner далей зацікаўлены купляць. Але мы абсалютна вольныя ў сваіх дзеяннях.

Зараз усё вельмі прагматычна, шоу-бізнес зводзіцца да простай лічбы. Ніхто не будзе разбірацца, наколькі ты перспектыўны, таленавіты,— пакажы лічбы праслухоўванняў і праглядаў! Ёсць лічбы — ты цікавы лэйблам.

**— А праўда ж, у нашых музычных колах да вас неяк не вельмі сур'ёзна ставіліся? Тыя ж музычныя журналісты, напрыклад. Маўляў — ну нешта іграюць, і няхай сабе. Можа, уплывала і тое, што вы асабліва не прасоўвалі сябе, ды й працягвалі працаваць на сваіх работах. Ёсць адчуванне, што цяпер вы ўсім кшталту "даказалі"?**

**Юрый**: Няма ніякай гарантыі, што калі звольніцца з працы і засесці ў студыі, то створыш хіт, які разыдзецца па свеце.

**Усевалад**: Я вам раскажу пра паказальны выпадак. Калі мы па WhatsUpp размаўлялі з Грэгам Нэйдлам — адным з Топ-50 асноўных менеджараў шоу-бізнесу — Юра паралельна праглядаў коменты пад артыкулам пра August на буйным беларускім інфармацыйным партале. А там — "Што за муць!", "Якая шэрасць!", "Як гэта можна слухаць!" і таму падобнае, працэнтаў 90 каментарыяў былі негатыўныя. І мы чарговы раз пераканаліся ў тым, што не трэба звяртаць увагі на коменты і на выказванні розных крытыкаў. Я дагэтуль захоўваю пост аднаго вядомага журналіста, які загадвае музычным накірункам на іншым вельмі папулярным партале: ён рэзка адмоўна пра нас выказваўся — маўляў, калі Intelligency гэта будучае беларускай музыкі, то проста жах! Я гэты пост, мабыць, у рамачку павешу да сябе на сцяну! (смех) Цяпер мы з поўным правам можам пачаць сумняваецца не ў сваім таленце, а ў прафесіяналізме такога крытыка.

**Юрый**: Па вялікім рахунку, нас гэта і не вельмі турбуе, мы ніколі не адказвалі на крытычныя напады, нам проста ў радасць ствараць музыку, нам падабаецца сам працэс. І справа не ў тым, што мы камусьці ўцерлі нос, падпісаўшы кантракт, — мы зразумелі, што наша музыка можа падабацца не толькі вузкаму колу слухачоў, а мільёнам і мільёнам людзей. Вось гэта галоўнае і самае прыемнае.

К

# “Мудрагеліста тасуецца калода...”

## *Пакручасты шлях графа Сямёна Зорыча праз Шклоў*

*(Заканчэнне. Пачатак у №№ 15—18, 20—25)*

### ВАНДРОЎНАЯ ВУЧЭЛЬНЯ

Закрыццём шклоўскага тэатра скончылася слаўная эпоха прыгоннага балета на тэрыторыі Беларусі. Праз паўстагоддзя будынак быў разабраны і на яго месцы з'явіўся касцёл, які ў трохі рэканструяваным выглядзе і сёння ўпрыгожвае горад.

Шклоўскай шляхетнай вучэльні пашанцавала больш — яна не сышла ўнівеч. З апошніх выхаванцаў Кадэцкага корпуса (так ён стаў называцца пасля смерці Зорыча) вядомыя такія імёны, як Арсень Закрэўскі — генерал-губернатар Фінляндыі, потым міністр унутраных спраў Расійскай імперыі і маскоўскі генерал-губернатар; Васіль Марчанка — дзяржаўны сакратар Расіі. пры Мікалаі I — і многія іншыя вядомыя імёны. Адзін з апошніх падпаручнікаў, выпушчаных Зорычам у Шклоўскай вучэльні ў чэрвені 1799 года Якаў Захаржэўскі потым стаў генералам ад артылерыі, удзельнічаў у войнах з Напалеонам — ад бітвы пры Прэйсіш-Эйлау (1807) да Лейпцыгскай бітвы Народаў (1813). Яго калега па вучэльні падпаручнік Якаў Цібянькоў пабываў на Барадзінскім полі, а пазней стаў генерал-лейтэнантам.

А ўжо налета наступнага пасля смерці Зорыча 1800 года выхаванцаў вучэльні перавялі спачатку ў Гродна, дзе яна стала называцца “Аддзяленнем кадэцкага корпуса Гродзенскага”. Першым яго дырэктарам стаў генерал-маёр Вільгельм Кетлер, а ротным камандзірам і экзерцымайстрам (адказным за навучанне кадэтаў) — падпалкоўнік Рыгор Пяцігорскі. Месцілася гэтая вучэльня на беразе Нёмана, у палацы, пабудаваным у стылі ракако ў сярэдзіне XVIII стагоддзя каралём польскім і вялікім князем Літоўскім Аўгустам III. Месца сімвалічнае: там у 1793 годзе адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай, і там жа праз якія два гады адрокся ад трона яе апошні кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

У 1807 годзе Гродзенскі корпус перабазаваўся ў Смаленск, потым — у Цвер, Яраслаўль, Кастраму... І, нарэшце, у 1824 годзе ён “асеў” у Маскве, дзе знаходзіцца і па сёння пад назвай Першы Маскоўскі кадэцкі корпус. Сярод яго выпускнікоў розных гадоў такія вядомыя ваеначальнікі, як Віталь Троцкі, Павел Ванінскі, Міхаіл Тухачэўскі, Сяргей Маркаў, Мікалай Брэдаў, Мікалай Невадоўскі, Павел Шацілаў, Даніл Канажэўскі... А таксама людзі творчыя: Павел Фядотаў — не толькі афіцэр, але і выбітны мастак, аўтар карцін “Сватанне маёра” і “Свежы кавалер”; Іван Ларыёнаў — афіцэр і аўтар знакамітай песні “Калінка-малінка”, якую ўсе лічаць народнай, Іван Рэрберг — інжынер-архітэктар, аўтар праектаў Кіеўскага вакзала і Цэнтральнага тэлеграфа ў Маскве...

І ва ўсіх гэтых выхаванцаў — адзін агульны корань, які пусціў сакавітыя парасткі ў беларускай зямлі: Шклоўская шляхетная вучэльня і яе стваральнік Сямён Гаўрылавіч Зорыч.

### ПАМЯЦЬ ЯК АДЗІНАЯ МЕРА ЧАСУ

Як мы ўжо пісалі, магілы Зорыча ў Шклове сёння не ўбачыш. Затое ўдзячныя нашчадкі ўзвялі яму годны і прыгожы помнік — першы ў свеце. Запытаў у вядомага скульптара, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Уладзіміра Слабодчыкава, дзе ён чэрпаў натхненне на гэты вобраз. І пачуў у адказ: “...натхняў мяне найперш менавіта шклоўскі перыяд жыцця нашага героя і яго гістарычная роля ў будаўніцтве духоўнай культуры гэтага беларускага рэгіёна”.

— Калі абвясцілі конкурс на праект помніка, я вырашыў прыняць у ім удзел, — распавядае спадар Уладзімір. — Спачатку праект мы распрацоўвалі ўдваіх з архітэктарам, лаўрэатам Ленінскай прэміі Юрыем Градавым. Зрабілі эскіз, дзякуючы якому сталі пераможцамі ў конкурсе. Потым, у сувязі з вельмі жорсткімі тэрмінамі выканання замовы, вырашылі запрасіць скульптара Алега Варвашэню вылепіць рэльефы на калонах і картуш з тэкстамі. Дапамагаў нам і шклоўскі архітэктар Георгій Сіваеў. Я цалкам заняўся фігуратыўнай часткай помніка, Алег Варвашэня з Градавым — цыліндрычным пастаментам з чырвонага граніту, на якім абодва распрацоўвалі рэльефы з выявай чатырох фігур — прадстаўнікоў шклоўскага тэатральнага бамонду і шляхетнай вучэльні. А паміж рэльефамі — картушы ў выглядзе апраўленых завіткамі шчытоў з інфармацыяй аб важкім унёску Зорыча ў культурнае і грамадскае жыццё Шклова. Галоўны надпіс на пастаменце абвяшчае: “Зорычу Сямёну Гаўрылавічу ад удзячных шклаўчан”.

Спачатку мясцовыя ўлады мелі намер усталяваць помнік ля Шклоўскага краязнаўчага музея, але потым вырашылі паставіць у парку: існуе інфармацыя, што менавіта Зорыч стаяў ля вытокаў яго з'яўлення. Мы пастараліся знайсці максімальна ідэальныя прапорцыі для таго, каб манумент гарманічна ўпісаўся ў ландшафтнае асяроддзе. І, як падаецца, вынік гараджанам і турыстам падабаецца.

Фота з архіва Уладзіміра Слабодчыкава

**Помнік Сямёну Зорычу, адкрыты 2 верасня 2007 года.**

Асоба Сямёна Гаўрылавіча Зорыча, вядома, нас вельмі прыцягвала: гэта быў цікавы і адначасова вельмі няпросты чалавек. Магчыма, хвацкі авантурыст са знакам “плюс”... але жыццё і лёс яго ў кожным разе вартыя захаплення. Праўда, я вырашыў не прадстаўляць воінскія ордэны Зорыча на яго камзоле, атрыманыя ім яшчэ задоўга да прыезду ў Шклоў, а таксама характэрныя для ваеннага чалавека таго часу атрыбуты — кірасу, эпалеты, шпагу. Аднак пастараўся зрабіць усё астатняе максімальна дакладна з гістарычнага пункту гледжання: парык з коскай, бант на шыі, жабо, пояс, гузікі на камзоле, фалды і абшлагі на рукавах, панталоны, запраўленыя ў батфорты.

Атрымалася фігура вышынёй 2 метры і 25 сантыметраў. Зрабіўшы крок наперад, Зорыч левай рукой беражліва прыціскае да сэрца скрутак архітэктурных чарцяжоў. Правай — нібы паказвае месца, на якім, паводле яго задумы, будуць пабудаваныя галоўныя дзеяшчы — Шляхетная вучэльня і тэатр. Погляд яго мэтанакіраваны, звернуты ў будучыню...

Для мяне самым складаным было знайсці кампраміс паміж маім асабістым светадачуваннем і ментальнасцю людзей таго часу. Бо я мастак XXI стагоддзя. Таму, зразумела, не магу і не хачу тварыць так, як гэта рабілі, скажам, у эпоху Асветніцтва сучаснікі Зорыча — скульптары стылю барока і класіцызму Эцьен Марыс Фалькане, Жан-Антуан Гудон, Міхаіл Казлоўскі або Іван Мартас. Аднак працуючы над такім “класіцыстычным” помнікам, я ўсё ж, як прафесіянал, пастараўся знайсці “залатую сярэдзіну”...

Адкрыццё помніка адбылося 2 верасня 2007 года — у Дзень беларускага пісьменства — і стала сапраўдным святам не толькі для аўтараў і ўсіх жыхароў Шклова, але і для тысяч гасцей, якія прыбылі ў гэты “намолены” горад з розных канцоў краіны ды з блізкага і далёкага замежжа. Што асабліва прыемна, былі і прадстаўнікі Сербіі — “малой радзімы” Сямёна Гаўрылавіча Зорыча.

А зусім нядаўна выдавецкім цэнтрам “Марка” РУП “Белпошта” падрыхтаваны паштовы праект, прысвечаны Шклову. Малюнак помніка Сямёну Зорычу змешчаны на паштовай марцы, выпуск ва ўжытак якой запланаваны сёлета 28 чэрвеня. Яна працягвае серыю паштовых марак “Гарады Беларусі”, распачатую ў 2014 годзе. Дызайн выканала вядучы дызайнер ІЦ “Марка” Яўгенія Бядонік.

### БЫ КВЕТКА АМЯЛА

Вось, пэўна, і ўсё, што я хацеў распавесці пра бурлівае і поўнае парадоксаў жыццё Сямёна Гаўрылавіча Зорыча. Выкажу нечаканае параўнанне: Зорыч, як гістарычны феномен, нагадвае мне амялу — прыгожую, пачуццёвую, але атрутную кветку. Старажытныя грэкі верылі, што амяла валодае сілай павялічваць урадлівасць і даваць жыццё. Аднак пры гэтым яны ведалі і негатыўныя ўласцівасці краскі, якая можа сваім сокам нанесці шкоду здароўю чалавека. Праўда, скандынавы лічылі амялу раслінай міру і пад яе галінамі заключалі перамір'і.

Пра Сямёна Зорыча наогул напісана даволі шмат. Вядомы пісьменнік-эмігрант Марк Алданаў, напрыклад, прысвяціў яму цэлы раздзел у рамане “9-га Тэрмідора”. Літаратар “адправіў” свайго выдуманага галоўнага героя Юлія Штааля на вучобу ў рэальную Шклоўскую шляхетную вучэльню Зорыча і падрабязна апісаў іх прыязныя ўзаемаадносіны. Твор Пушкіна я ўжо згадваў у адной з папярэдніх серый.

Пра Зорыча шмат пісалі і яго сучаснікі, і аўтары пачатку XX стагоддзя, пішуць і сёння. Хтосьці — з рэзкім негатывам, робячы акцэнт на яго нездаровы азарт карцёжніка і асабліва на цьмяныя шклоўскія падзеі, звязаныя з фальшываманецтвам. Хтосьці спрабуе аб'ектыўна разабрацца ў біяграфіі Зорыча, але блытаецца ў дэталях гістарычнага і быційнага характару. І ў першым, і ў другім выпадку сустракаецца вельмі шмат недакладнасцяў, дадумак, дылетанцтва, слабага ведання гістарычных дэталяў той эпохі — а часам і проста хлусні.

Карацей кажучы, фундаментальнай кнігі пра жыццё і лёс Сямёна Гаўрылавіча Зорыча пакуль што, на жаль, няма — гэтаксама, як і мастацкага кінафільма або тэлесерыяла. А ён жа клічнік нашай шматпакутнай гісторыі!

Але, разам з тым, радуе, што нават непрымірымыя праціўнікі Зорыча не могуць прынізіць яго выдатны ўнёсак у ваенную і культурную адукацыю “залатой эпохі” Асветніцтва. Няма сумневу, у беларускі падмурак уклаў свой камень і серб Сямён Зорыч. Я не ведаю іншых падобных прыкладаў, калі дзякуючы намаганням аднаго чалавека ўсяго за два дзясяткі гадоў маленькае правінцыйнае мястэчка Шклоў ператварылася ў горад еўрапейскага ўзроўню.

І не віна Зорыча, што пасля яго смерці амаль усе ягоныя прыжыццёвыя дасягненні пайшлі прахам. Затое засталася Памяць, якая не можа сцерціся, а гэта нямала...

Так што не трэба меркаваць пра асобу ў адной плоскасці. Свет мнагамерны і шматаб'ёмны. І кожны чалавек — ад вялікага да “простага смяротнага” — ідзе праз гэты свет са сваімі плюсамі і недахопамі. Інакш не бывае.

Адно што, робячы падсумаванні, важна старацца аддзяляць збожжа ад пустазелля...

**Барыс КРЭПАК**

# Таямніцы Манюшкаў

*Частка XIII*

*(Працяг. Пачатак у №№ 12 — 18, 20 — 25)*

**Пачатак вайсковай кар'еры Станіслава Закрэўскага прыпаў на кульмінацыю трагедыі Рэчы Паспалітай Дзвюх Нацый. Вайна Расійскай імперыі супраць Барскіх канфедэратаў 1768 — 1772 і першы падзел у 1772 (зацверджаны, нягледзячы на мужны супраціў паслоў з ВКЛ на чале з Тадэвушам Рэйтанам) былі пралогам да поўнага знішчэння краіны. І ён, былы выдатны камічны акцёр, а цяпер вялікалітоўскі афіцэр, з гонарам прайшоў праз усе выпрабаванні, якіх на яго лёс выпала нямала.**

## PRO ET CONTRA РЭФОРМАЎ

3 мая 1791-га была прынятая знакамітая Канстытуцыя Рэчы Паспалітай, якая лічыцца першай у Еўропе. Прысутнічала пры гэтым усяго 157 з 500 паслоў Вялікага сойма. Назіраючы за ростам пратэстных настрояў у грамадстве — не ўсім падабаліся ўхваленыя народнымі абраннікамі рэформы — а таксама заслухаўшы даклад аб "пагрозе чарговага падзелу", які падрыхтаваў берасцейскі пасол Тадэвуш Матушэвіч, завадатары рэформаў вырашылі паспяшацца.

Гэтаму дню папярэднічала руплівая праца "сакрэтнага камітэта" з сямі асобаў, якія спехам, часам недасканала, але ўпарта рыхтавалі кардынальныя змены ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ і Кароны. Напрыклад, была адмененая выбарнасць караля — яе замяняла спадчынная манархія. Гэта, вядома, не гарантавала розных забурэнняў і знешніх уплываў (тут будзе дарэчы прыклад Расіі, дзе мала хто з цароў ці царыц развітаўся з жыццём натуральным чынам), але змяншала верагоднасць грамадзянскай вайны прэтэндэнтаў на трон. А яе разбуральныя для краіны прыклады ўжо здараліся не раз.

Не маючы на мэце пералічаць *"pro"* і *"contra"* гэтай Канстытуцыі, скажам толькі адно: насуперак пашыранаму меркаванню, аўтаномію ВКЛ яна не скасоўвала. Праўда, 5 мая сойм адмяніў ранейшыя заканадаўчыя кодэксы, у лік якіх трапляў і Статут ВКЛ 1588 года. Але неўзабаве паміж ліцьвінамі і "каранямі" пачаліся вострыя дыскусіі. Баронячы адміністрацыйна-судовую самастойнасць, паслы з ВКЛ не пагадзіліся нават на тое, каб наш Статут — які ідэолаг новай канстытуцыі Гуга Калантай назваў "*вышынёй чалавечага розуму і самай дасканалай кнігай законаў ва ўсёй Еўропе*" — стаў асновай новага кодэкса грамадзянскага і крымінальнага права, агульнага для ВКЛ і Польшчы.

І ўсё ж, нягледзячы на розніцу ў поглядах на "агульную справу", у ВКЛ шырока святкавалася ўхваленне новай Канстытуцыі. Але адначасова з гэтым некаторыя напалоханыя радыкальнымі рэформамі шляхціцы і магнаты марылі аб захаванні спарахнелага прынцыпу "старыны не рухаем, навіны не ўводзім".

Гэтаксама меркавалі і паза межамі Рэчы Паспалітай. Пэўны лібералізм Канстытуцыі ў адносінах да сялянаў так напалохаў Кацярыну II, што яна рашылася на канчатковае "*уничтожение Польши и на раздел её земель*". Ужо 16 мая 1791 года ў Пецярбургу быў распрацаваны план уварвання ў Рэч Паспалітую экспедыцыйнага корпуса. Да часу яго прытрымалі, чакаючы, каб "*не од нас был первой выстрел*". Патрэбна было, каб знайшліся ахвотныя прызваць Кацярыну II на дапамогу. І такія знайшліся.

27 красавіка 1792 года ў Пецярбургу пяць "прамаскоўскіх" магнатаў з Рэчы Паспалітай падпісалі акт канфедэрацыі, датаваны 14 мая і нібыта падпісаны ў польскім мястэчку Таргавіца (адсюль і назва "Таргавіцкая канфедэрацыя). Дзяржаўныя войскі Рэчы Паспалітай былі ў падпарадкаванні патрыётаў-рэфарматараў, таму канфедэраты запрасілі падмогі ў Кацярыны II. І вось тады экспедыцыйны корпус, падзелены на дзве часткі, рынуўся ў ВКЛ і Польшчу. Так пачалася вайна 1792 года. І самы чынны ўдзел у ёй, разам са сваім 8-м пяхотным палком імя Радзівілаў, узяў і наш герой — Станіслаў Закрэўскі.

З дзесяці бітваў той вайны сем адбыліся на землях ВКЛ — Стоўбцы, Мір, Зэльва, Берасце... Але стрымаць рэгулярныя расійскія часці новаствораныя, лічы, войска Рэчы Паспалітай не змагло. Хоць здараліся і перамогі.

Менш чым праз год Гарадзенскі сойм ухваліў другі падзел Рэчы Паспалітай, згодна з якім у дадатак да ўсходняй Беларусі пад акупацыяй аказалася і цэнтральная. У ацалелай частцы краіны запанавала рэакцыя.

## КУМОЎСКІЯ ПОВЯЗІ

І тады Станіслаў Закрэўскі пакідае войска ды неўзабаве перабіраецца ў Вільню. Там яго сям'я блізка сыходзіцца з Мюлерамі. Варта нагадаць, што віленскі бургамістр Ян Мюлер быў дзедам Аляксандры, жонкі Станіслава Манюшкі. Гісторыя Мюлераў чакае нас наперадзе. Адцемім пакуль адно: Марыяна Закрэўская ў 1798 годзе стала кумой сына Мюлераў — што, вядома, сведчыць пра блізкасць дзвюх сямей.

Ёсць звесткі і пра тое, што Станіслаў Закрэўскі — як і Ян Мюлер — быў на баку кіраўніка паўстання 1794 года ў ВКЛ генерала Якуба Ясінскага і браў чынны ўдзел у тых падзеях. Падчас выбуху паўстання 8-мы пяхотны полк імя Радзівілаў быў адноўлены. У яго вярнуліся афіцэры, якія знаходзіліся за мяжой. Сам полк падзялілі на два батальёны. Адным з іх, як вынікае з успамінаў цытаванага раней лекара Станіслава Мараўскага, камандаваў сам Закрэўскі, ужо капітан. Полк браў удзел у бітве пад Соламі 25 чэрвеня і ў першай абароне Вільні 19 — 20 ліпеня. Далейшыя баявыя дзеянні з удзелам Станіслава нам пакуль невядомыя.

Пасля паразы паўстання Закрэўскія вяртаюцца да мірнага жыцця ў Вільні. Там яны і даведаліся пра трэці падзел (1795), у выніку якога рэшта беларускіх земляў, Вільня і Жамойць на доўгія гады патрапілі пад расійскую акупацыю.

Магчыма, Марыяна працягвае сваю тэатральную кар'еру — якую, верагодна, завершыць у 1803 годзе. Але да таго часу ў сям'і Закрэўскіх адбудзецца папаўненне. 19 лістапада 1802 года ў віленскім касцёле святога Яна адбылася падвоеная ўрачыстасць. Ахрысцілі дзвюх дзяўчынак — Альжбету і Марыяну. Цікава, што кумой Альжбеты стала Альжбета з Краўзаў, жонка Яна Мюлера, у гонар якой, уласна, і назвалі дзяўчынку. Асістэнтам — капітан расійскага войска Георгій Лісаневіч, які пасля смерці Яна зойме "яго месца", стаўшы другім мужам Альжбеты. Што прывядзе да заняпаду квітнеючай гаспадаркі Мюлераў.

Пацытуем адну з метрык: "*Я, які вышэй (*Станіслаў Рыла, віцэ-пробашч віленскага парафіяльнага касцёла св. Яна — заўв. **З.Ю**), *дапоўніў святыя абрады хросту дзяўчынкі на імя Марыяна, якая мела сем гадоў, дачкі вяльможнага пана Станіслава Закрэўскага, капітана войска польскага, і вяльможнай пані Марыяны з дому Вернэраў, законных сужэнцаў. Яе хроснымі былі вяльможны пан Даніла Бельскі, капітан войска польскага, з вяльможнай пані Марыянай Мараўскай, антэрпрэнёркай Віленскага тэатра*" (пераклад — Алесь Жлутка).

## ВІЛЕНСКІ ГВАРДЗЕЕЦ І МАСОН

Пасля смерці князя Караля Станіслава Станіслаў Закрэўскі працягваў "сяброўства" з Радзівіламі — і "перайшоў у ранцыну" да пляменніка "Пане Каханку" Дамініка. Той, як памятаем, таксама з вялікай прыязнасцю ставіўся да былога акцёра. З ласкі Дамініка Закрэўскі атрымлівае жытло ў гэтак званай "Кардыналіі" — старым палацы Радзівілаў у Вільні. Ягоным першым уласнікам быў кардынал Юры Радзівіл (1556 — 1600). Пазней там месціліся тэатр і офіс Дабрачыннага таварыства, сябрам якога ажно да скону быў Закрэўскі.

Атрымлівае ён і больш дробныя дывідэнды — скажам, дармовыя дровы ("дзесяць коп") для ацяплення вялікай і прыгожай кватэры. Пазней, ужо пасля 1812 года, пракуратар Радзівілаўскай камісіі Залескі, абвясціўшы дакумент аб "дрэве" падробным, паспрабаваў Закрэўскіх такіх прывілеяў пазбавіць. Распачаўся судовы працэс. Можна меркаваць, што яго Закрэўскія выйгралі, бо захавалі і кватэру, на якую Залескі таксама меў пэўныя планы.

У 1808 годзе Станіслаў узяў у князя Радзівіла падрад "*на рыццё фундамента пад тэатр у Вільні на вуліцы Троцкай*". За земляныя працы, якія правяла брыгада Закрэўскага (мо былыя саслужыўцы капітана?), як сведчаць радзівілаўскія паперы, сам "брыгадзір" зарабіў 303 злотых. Што па тых часах даволі няблага.

У 1812 годзе, калі ў Вільню ўвайшлі французы і спешна пачало ствараца новае войска ВКЛ, немаладога ўжо Станіслава Закрэўскага праз яго былыя заслугі і патрыятызм прызначаюць камплектаваць віленскую гвардыю. Дарэчы, і бацька Станіслава Манюшкі, і яго дзядзькі не засталіся ў баку ад тых падзей, бо таксама былі патрыётамі княства і марылі аб аднаўленні знішчанай краіны.

Але яшчэ да вайны, у 1811 годзе, Станіслаў аддаў старэйшую дачку Альжбету за капітана расійскіх войскаў Станіслава Мюлера — сына свайго сябра Яна. А ў 1812-м, ужо пры французах, Закрэўскія аддалі і малодшую, Марыяну. Ейным мужам стаў другі сын Яна Ксаверый Мюлер, харужы віленскага павета.

Праз пэўны час у іх народзіцца дачка Аляксандра, якая ў 1840 годзе стане жонкай мала каму вядомаму на той момант віленскага арганіста Станіслава Манюшкі. Аб гэтым было ў папярэдніх частках "Таямніц". Дзе, між іншым, вялася гаворка і пра тое, што Аляксандра "апынулася" больш чым на год старэйшай за мужа — а не на год ці два маладзейшая, як па замоўчванні лічыцца ў наш час.

Што яшчэ варта дадаць да партрэта Станіслава Закрэўскага... Як і многія прадстаўнікі віленскага бамонду, ён уваходзіў у масонскую ложу "Дасканалая еднасць". Разам з ім на чорных лавах падчас таямнічых рытуалаў пры свечках сядзелі Дамінік Манюшка (фундатар дзвюх школ для сялянскіх дзетак у сваім маёнтку Радкоўшчына), граф Міхал Валіцкі (славуты аферыст і мецэнат, сваяк першага біёграфа Манюшкі Аляксандра Валіцкага), Ігнат Ходзька (вядомы пісьменнік, аўтар выдатнага твора "Успаміны квестара"), Станіслаў Мюлер (шубравец, былы вайсковец, аўтар, складальнік грунтоўных слоўнікаў і сваяк Закрэўскага), Дамінік Рэйтан (пляменнік Тадэвуша, былы вайсковец, адзін з галоўных фундатараў каменнага будынка для Слуцкай гімназіі, які захаваўся дасюль), Ян Рустэм (стваральнік Віленскай мастацкай школы) і вельмі шмат іншых цікавых асобаў.

Каб завершыць гэты раздзел, трэба распавесці, калі і дзе абарвалася жыццё Станіслава Закрэўскага. Знайсці такія звесткі пра яго жонку пакуль не ўдалося.

Памёр ён 29 ліпеня 1834 года ў Вільні ад дыярэі. "*Падпалкоўнік войск польскіх, сябра Віленскага таварыства Дабрачыннасці, Святаянскай парафіі, маючы семдзясят восем год жыцця, пакінуў дзвюх дачок — Альжбету па мужу Мюлер, капітанаву, і Марыю, па мужу палкоўнікаву*". Пахаваны быў 1 жніўня, на ўласным участку на Бернардынскіх могілках.

**Зміцер ЮРКЕВІЧ,**
**гісторык-архівіст**

Працяг —
**у наступных нумарах "К".**

**Генерал-лейтэнант Якуб Ясінскі. Мастак невядомы.**

**Трактат Рэчы Паспалітай з Прускім каралеўствам пра Другі падзел. Фрагмент. 25 верасня 1793 года.**

**Метрыка смерці Станіслава Закрэўскага.**

**Метрыка хросту Марыяны Закрэўскай.**

# Адзін з самых значных

*Легендарны спектакль вяртаецца на сцэну*

**Да 75-годдзя Вялікай Перамогі Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы аднаўляе адзін з самых значных спектакляў новага стагоддзя — "Не мой" паводле аповесці Алеся Адамовіча "Нямко". Паказы адбудуцца 30 чэрвеня і 2 ліпеня. Таксама ў Каміннай зале тэатра ўпершыню будзе прадстаўлена ўнікальная выстава з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры "Алесь Адамовіч..."**

Надзея КУДРЭЙКА

Прэм'ера спектакля "Не мой" у пастаноўцы рэжысёра Аляксандра Гарцуева адбылася 10 гадоў таму. Гэта гісторыя пра тое, як беларуская дзяўчына Паліна ў час вайны выратавала юнага нямецкага салдата Франца, выдаючы яго за свайго нямога брата. Так на пажарышчах і рэштках беларускіх вёсак нараджалася каханне — як тое адзінае, што дазваляе выжыць у нечалавечых умовах.

На Нацыянальнай тэатральнай прэміі спектакль "Не мой" атрымаў узнагароду як "Найлепшы спектакль 2010 года" і перамог яшчэ у чатырох намінацыях: "Найлепшая жаночая роля" была ў Святланы Анікей, прыз за "Найлепшую сучасную пастаноўку паводле твораў беларускіх аўтараў" атрымалі рэжысёр Аляксандр Гарцуеў і аўтар інсцэніроўкі Алена Калюнова, прыз за "Найлепшую працу мастака-пастаноўшчыка" дастаўся Барысу Герлавану, а за "Найлепшае музычнае афармленне" — Алегу Хадоску. Таксама ў 2013 годзе "Не мой" стаў уладальнікам Гран-пры XI Міжнароднага фестывалю "Славянскія сустрэчы", прыз за найлепшую сцэнаграфію атрымаў Барыс Герлаван, а за найлепшы акцёрскі дуэт — Аляксандр Казела і Валянціна Гарцуева.

Экспазіцыя выставы "Алесь Адамовіч..." у Каміннай зале тэатра прадставіць творчы і жыццёвы шлях пісьменніка і кінасцэнарыста, які ў сваёй творчасці даследаваў лёсы людзей пад час вайны.

К

**На здымку: сцэна са спектакля "Не мой".**
Фота прадастаўлена НАТ імя Я. Купалы

## МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. Леніна, 20.*
*Тэл.: 327 45 62.*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
■ **"Сусвет Язэпа Драздовіча".**
Выставы:
■ Выстава твораў мастакоў Беларусі — юбіляраў 2020 года **"Плынь часу"** (ў рамках праекта "Нашы калекцыі").
■ Выстава **"Чырвоны — код нацыі. Сакральнасць, эстэтыка, улада"** ("дыялог" твораў розных эпох, відаў і стылістычных кірункаў) — да 2 жніўня.
■ Выстава твораў вядомага беларускага мастака Уладзіміра Сулкоўскага (19.07.1950 — 16.05.2013) **"Яго зямля, яго людзі"**, прымеркаваная да 70-годдзя з дня яго нараджэння — да 23 жніўня.
■ Сумесны культурна-адукацыйны праект-квэст Нацыянальнага мастацкага музея і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **"Аб Вялікай Айчыннай..."** — з 3 ліпеня.
■ **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
■ Віртуальная выстава **"Дзеці мастакоў"** (хто глядзіць на нас з дзіцячых партрэтаў, што належаць пэндзлю вядомых майстроў жывапісу, графікі, скульптуры?)

*Філіялы музея*

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.*
*Тэл.: 327 88 78.*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".**
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
■ Майстар-клас па традыцыйнай тэхніцы роспісу вялікодных яек "Пісанкі".
Кожную няделю а 12-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
*г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.*
*Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66.*
*Музей працуе: аўторак-нядзеля з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), панядзелак — выхадны.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"Героі вайны на Краснай плошчы"**, прысвечаная 75-годдзю Перамогі і 75-годдзю парада Перамогі — да 6 ліпеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
*г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.*
*Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.*
*Палацавы ансамбль*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Аўтарская выстава карцін Алеся Сурава **"Паштоўкі з мястэчка"** — да 15 лістапада.
■ Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.

*Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці*
*Вул. Гейсіка, 1.*
■ Выстава работ маладога мастака Ксеніі Сушы **"Дакрананне"** — да 16 жніўня.
*Ратуша:*
*г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выходкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.
*Слуцкая Брама:*
■ Выстава каталіцкіх, уніяцкіх і праваслаўных крыжоў розных гістарычных перыядаў **"Крыж: арыенцір, сімвал, памяць"** — да 30 верасня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.*
*Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі".**
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку".**
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя".**
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар..."**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако".**
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку".**
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.

## ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
*г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.*
*Тэл.: 327 26 12.*
■ Выстава дыпломных праектаў выпускнікоў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКіМ — да 15 ліпеня.

**У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:**

магазіны "Белсаюздрук"
**Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
**Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
**Праспект Незалежнасці, 44.**
**Вуліца Валадарскага, 16.**

кіёскі "Белсаюздрук"
**ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
**Праспект Пераможцаў, 5.**
**Вуліца Рабкораўская, 17.**
**Праспект Незалежнасці, 68, В.**
**Вуліца Лабанка, 2.**

**ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"**
**звяртайцеся па тэлефоне**
**+ 375 17 286 07 97**
**і па тэлефоне/факсе**
**+375 17 334 57 41**
**альбо пішыце на электронны адрас**
kultura@tut.by!

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.**

**З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").**